Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 31 1932 г. № 244 (4496)

Год выдання XVI

Для бальшавікоў Беларусі няма больш ганаровай задачы, чым сваячасовае і поўнае выкананьне сваіх абавязацельстваў

ПАКОНЧЫЦЬ З НЕДАПУШЧАЛЬНЫМІ АДНОСІНАМІ да ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЭРАЦЫІ

Прамысловая каапэрацыя Савецкай Беларусі, якая займае адно з найвялікшых месц у справе вырабу прадметаў шырокага ўжытку, да 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі прыходзіць з вялізнымі дасягненьнямі. Рост прадукцыі прамкаапэрацыі з году ў год усё павялічваецца. Калі ў 1931 годзе агульна-валавая прадукцыя складала суму 132 млн. руб., дык у 1932 годзе яна дасягае да 228 млн. руб. Удзельная вага прадукцыі прамкаапэрацыі да ўсёй прамысловасьці БССР складае 23 проц., а да лёгкай—55 проц. Адсюль зусім ясна тая вялізарнейшая роля прамкаапэрацыі, якую яна адыгрывае ў сыстэме народнай гаспадаркі БССР.

Верасьнёўскі пленум ЦК УсесКП(б) паставіў перад прамысловай каапэрацыяй задачы вялікай гаспадарча-палітычнай важнасьці—па пашырэньні вырабу тавараў шырокага ўжытку і разгортваньні савецкага гандлю.

Выканаць гэту дырэктыву пленуму прамкаапэрацыя зможа толькі пры ўмове аказаньня ўсялякай дапамогі і падтрыманьня з боку гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый. У сваёй перадавой «Правда» пісала:

«Недаацэнка прамысловай каапэрацыі, ігнараваньне яе нізавога зьвяна—арцелі, б'юць па вырабе прадметаў шырокага ўжытку. Час пакончыць з недапушчальнымі адносінамі да прамысловай каапэрацыі. Погляды на прамкаапэрацыю, як на арганізацыю трэцярадную, адыйшлую, нясумяшчальную з бурным ростам нашай сацыялістычнай прамысловасьці—шкодныя. Пагарда лівыя, высокамерныя, чванлівыя адносіны да саматужніцкай арцелі, саматужніка-адзіночкі, нічога агульнага з лініяй партыі ня маюць».

Але бюракраты, «левыя» загібшчыкі Віцебшчыны, Мазыршчыны і г. д. не зразумелі гэтай палітычнай устаноўкі партыі наконт прамысловай каапэрацыі. Абураючыя факты злачынна агідных, недапушчальных адносін да прамкаапэрацыі нельга тлумачыць толькі недаацэнкай з боку раду арганізацый. Не падлягае сумненьню што ў радзе выпадкаў мы маем справу з клясавым ворагам і яго агентам, які пралазае ў наш апарат і сьвядома зрывае выкананьне пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК УсесКП(б) адносна прамысловай каапэрацыі.

Верасьнёўскі пленум ЦК УсесКП(б) даў выразныя дырэктывы, «каб усе партыйныя, камсамольскія, прафсыянальныя і савецкія арганізацыі аказвалі ўсялякую садзейнасьць гаспадарчым арганізацыям і прамкаапэрацыі ў справе разгортваньня вырабу прадукцыі шырспажыву і штомесячна правяралі выкананьне ўказаньняў ЦК і СНК БССР і ход вырабу шырспажыву».

Ня гледячы на гэта, у радзе месц бюракраты і апарагуністы органаў камунальнай гаспадаркі пры садзейнасьці гарсаветаў і міліцыі выкідваюць маемасьць арцеляй райпрамсаюзаў, якія вырабляюць прадметы шырокага ўжытку.

Даю слова фактам:

Менскі налгас, ня гледзячы на забарону пракурора БССР, выкінуў спэцыяльпрамсаюз з займанага ім памяшканьня. **Вышэйшы савет фізкультуры Беларусі** таксама не знайшоў патрэбным лічыцца з забаронай таго-ж пракурора і ўдарамі мопатаў і ламоў узламаў дзьверы спэцыяльпрамсаюзу і захапіў памяшканьне сумесна з чарцяжамі і мэтамі капітальнага будаўніцтва гэтай сыстэмы.

Віцебскія галанцэрныя з камгасу ўзломамі замкоў захапілі памяшканьне самай буйнай арцелі на Віцебшчыне—Каапрамонт, якая абслугоўвае рамонтам абутку працоўных і калгаснікаў Віцебшчыны. Толькі ўмяшаньне «Праўды» прымусіла зарваўшыхся кіраўнікоў Віцебскага раёну вярнуць частку занятага памяшканьня.

Мазырская гарміяцыя пры садзейнасьці гарсавету заняла памяшканьне райпрамсаюзу, якое па дагаворы належыць яму на працягу дзесяці год.

Горацкі РВК на чале са старшынёю яго тав. **Тваровым** і старшыня гарсавету **Крупнева**, пры дапамозе міліцыі занялі памяшканьне райпрамсаюзу, якое пабудавана сіламі і сродкамі прамкаапэрацыі і прызначана для аднаго асноўнага цэху вытворчасьці—сталоўкі.

Старшыня сельсавету ў **м. Горках**, Горацкага раёну, **Панамарэў** выкінуў шавецкую арцель, памяшканьне якой патрэбна яму нібыта для «прыбываючых войск», распаўсюджваючы правакацыйныя антысавецкія чуткі, што «ў Беларусі абвешчана вайна».

«Захавальнікі» рэвалюцыйнай законнасьці **Сеньненскага** раёну **Абуненіч**, прадстаўнік райспажыўсаюзу **Курылін** пры актыўнай дапамозе прадстаўніка беларускага аддзяленьня Саюзскуры, пад пагрозай арышту забаранілі прадстаўніку прамкаапэрацыі тав. **Сандлеру** загатоўку сьвіных скур у раёне, матывуючы гэта тым, што «нам ня хопіць». Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ў радзе раёнаў Беларусі самым адкрытым чынам ігнаруюцца неаднаразовыя ўказаньні партыі і апошнія пастановы верасьнёўскага пленуму аб дапамозе прамкаапэрацыі ў справе разгортваньня вырабу прадметаў шырокага ўжытку.

Партыйныя арганізацыі павінны заразжа дабіцца рашучага пералому ў адносінах прамысловай каапэрацыі і забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду.

Трэба шырэй разгарнуць шэфства прафсаюзаў над сыстэмай прамкаапэрацыі. Неабходна на справе рэалізаваць пастанову ЦОПСБ аб пралетарскім буксіры і шэфстве прафсаюзаў над прамкаапэрацыяй.

Органы пракуратуры павінны самым рашучым чынам павесьці барацьбу з парушыцелямі рэвалюцыйнай законнасьці адносна прамкаапэрацыі, арцеляй і арцельшчыкаў.

па адгрузцы бульбы Ленінграду

Час ня церпіць

На 30 кастрычніка адгружана Ленінграду толькі 56,3 проц. пляну.

Дрэнны ход адгрузкі можна тлумачыць толькі тым, што раённыя арганізацыі не забясьпечылі баявой работы па загатоўках бульбы, ня ўдарылі як належыць па дэмабілізацыйных настроях, па супраціўленьні кулацтва і яго агентуры. Чым іншым, як ня курсам на апартуністычны самацёк можна тлумачыць той факт, што **Нараўлянскі, Чырвонаслабодзкі, Бешанковіцкі, Старобінскі, Брагінскі** раёны адгрузілі ад 13 да 23 проц. заданьня; што рашаючыя раёны — Бабруйскі, Рагачоўскі і інш. выканалі менш 50 проц. пляну.

Кіруючыя арганізацыі гэтых раёнаў недаацанілі вялізарнай палітычнай важнасьці задачы забясьпячэньня пралетараў Ленінграду і Ленінградзкай вобласьці асноўным відам харчаваньня—бульбай.

Аб тым, што ўся справа ў бальшавіцкай рабоце, ва ўменьні мабілізаваць усю грамадзкасьць на ажыцьцяўленьне баявога заданьня сьведчыць вопыт **Аршанскага і Кагарынскага** раёнаў, якія ўжо выканалі 88,7 проц. заданьня, сьведчыць практыка Лагойскага, Заслаўскага, Мсьціслаўскага і Лельчыцкага раёнаў, якія ўжо скончылі адгрузку.

Час ня церпіць! З кожным днём усё пагаршаюцца надворныя ўмовы для адгрузкі.

Поўнасьцю выканаць заданьне ў бліжэйшыя дні, не дапусьціць ніякай запазычанасьці ў абавязацельствах пралетарам Ленінграду—справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР.

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ

(у тысячах тон на 30 кастрычніка)

НАЗВА ЗАГАТОЎЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ	ПЛЯН	Адгружана з пачатку кампаніі	Процант выкананьня
Белкааплодагародніна	125	76,6	61,3
Белплодагародніна	66	30,8	46,6
РАЗАМ	191	107,4	56,3

Калгасы Случчыны—пралетарам Ленінграду

СЛУЦАК, 29 (Па тэлефону).

У калгасах Случчыны разгортваецца баявая работа па падрыхтоўцы да 15-й гадавіны Кастрычніка. У гонар гадавіны, калгас «Колас» датэрмінова адгрузіў 40 тон бульбы Ленінграду, што складае 104 проц. яго пляну. Але калгасьнікі «Коласа» ня спыніліся на гэтым. Яны здалі дзяржаве яшчэ 39 цэнтнэраў бульбы, атрыманай па працадніях.

Калгаснікі арцелі «Случ», у адказ на ліст ленінградзкіх рабочых, узялі на сябе абавязацельства даць рабочым гораду Леніна да кастрычніцкіх урачыстасьцяй 40 цэнтн. сьвінога мяса. Гэта абавязацельства ўжо выканана.

Харытончык.

Плян выканан з перавышэньнем

ДРЫСА, 27 (Белта).

Калгас «Росквіт», Боркавіцкага сельсавету, сваячасова скончыў уборку бульбы. У адзнаку XV гадавіны Кастрычніка калгас выканаў плян адгрузкі бульбы з **перавышэньнем.** Замест 15,5 тон адгружана 16 тон, або **123 проц. пляну.**

Заданьне па мясазагатоўках калгас «Росквіт» выканаў поўнасьцю і высунуў сустрэчны плян у разьмеры 50 кгр. Зараз калгасьнікі прыступілі да сартаваньня і захаваньня бульбы на зіму.

Скончылі адгрузку

Крупкі. 29. (Белта). Калгас «Пралетарская перамога», Грыцкаўскага сельсавету, поўнасьцю рэалізаваў пляны адгрузкі бульбы, і збожжазагатовак. Калгасы імя **Гея** (Хацюкоўскага сельсавету), **«Усход»** (Збярыцкага сельсавету), **«Чырвоны герой»** (Крушскага сельсавету) таксама выканалі заданьне па адгрузцы бульбы на 100 проц.

Абавязацельствы выканалі з гонарам

ЛЁЗНА. (Па тэлегр.). Калгасы Лёзьнянішчыны, пад кіраўніцтвам райпартарганізацыі, выканалі свой абавязак перад дзяржавай па здачы бульбы. Адгружана калгасамі каля 3.450 тон, або 106 проц. пляну. **Выдрэйскі, Высачанскі, Каралеўскі, Крыжаўскі і Сташаўскі** сельсаветы перавыканалі плян адгрузкі як па калгасным, так і па адзіласобным сэктарох.

Мінуцкі.

У адказ на выклік „Зьвязды" і „Рабселькора" арганізуем чырвоныя эшалёны з бульбай

Да ўсіх рабселькораў і калгасьнікаў Рагачоўшчыны, да ўсіх рабселькораў і калгасьнікаў Савецкай Беларусі

— Нашы калгасы: імя Сьвярдлова, Сьвяцкага сельсавету, і «Свабода», Гарадзецкага сельсавету, Рагачоўскага р-ну, прыходзяць да 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з вялізнымі дасягненьнямі. Дробныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі; хутары і сялёлкі ў мінулым, пераважныя ў нашыя калгасы—імя Сьвярдлова на плошчы 1.400 гект., які яднае 126 гаспадарак, і «Свабода», які займае 800 га і яднае 79 гаспадарак.

Калгас імя Сьвярдлова мае адну калгасную насьценгазэту і 2 брыгадныя, калгас «Свабода» таксама выпускае сваю насьценгазэту. Гэтыя газэты вылучаюцца лепшымі дапаможнікамі партарганізацыі ў выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній. Пры актыўнай рабоце калгасьнікаў-ударнікаў і 100 ударнікаў - селькораў, пад кіраўніцтвам партыйных ячэек, нашы калгасы пасьпяхова рэалізавалі свае загатоўчыя пляны. Калгас імя Сьвярдлова выканаў плян загатовак па бульбе на 132 проц., па збожжы — на 100 проц., па тэхкультурах — на 109,4 проц. Калгас «Свабода» выканаў плян па бульбе на 109 проц., збожжы — на 100 проц., мясе — 100 проц.

Гэтыя дасягненьні заваяваны намі ў выніку ўдарнай капэтыўнай працы брыгад, у выніку ўкараненьня зьдзельшчыны і сацыялістычных мэтадаў.

Прапрацаваўшы на агульным сходзе селькораў і членаў рэдкалегій, а таксама калгасьнікаў-ударнікаў адозву рэдакцый «Зьвязды» і «Рабселькора» аб арганізацыі патоку чырвоных абозаў з бульбай імя XV гадавіны Кастрычніка ў падарунак пралетарам гораду Леніна,—мы ГОРАЧА ПАДТРЫМЛІВАЕМ ГЭТЫ ЗАКЛІК.

Мы, ударнікі сацыялістычных палёў, арганізуем па Сьвяцкім і Гарадзецкім сельсаветах чырвоныя абозы з бульбай, ільном і заўш гадавога пляну здаем у парадку сустрэчнага: калгас імя Сьвярдлова — 10 цэнт. бульбы, калгас «Свабода» — 10 цэнт. бульнатрасты.

Мы абавязаемся скончыць поўнасьцю ўсе гаспадарча-палітычныя кампаніі, па-баявому арганізаваць пераворованьне бульбы з тым, каб не пакінуць у зямлі ні аднэй бульбіны.

Двум лепшым вытворчым брыгадам, якія па-бальшавіцку выконваюць усе гаспадарча-палітычныя кампаніі, беражліва адносяцца да калгаснай вытворчасьці, інвэнтар і збруі мы прысвойваем: аднэй — ІМЯ 15-га КАСТРЫЧНІКА, другой — ІМЯ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ.

Мы, селькоры і калгасьнікі-ўдарнікі, рэдактары і члены рэдкалегій насьценных газэт аварачаемся з заклікам да ўсіх селькораў, да ўсіх калгасьнікаў-ударнікаў, работнікаў мізавых газэт Рагачоўшчыны, у гонар XV Кастрычніка АРГАНІЗАВАЦЬ УСЕРАЁННЫ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З БУЛЬБАЙ ПРАЛЕТАРАМ ГОРАДУ ЛЕНІНА.

Мы заклікаем усіх селькораў — калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў усёй БССР, увесь нізавы і раённы друк узначаліць арганізацыю ўсебеларускага кастрычніцкага чырвонага эшалёну з бульбай.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве XV гадавіна Кастрычніка!

Па даручэньні сходаў ліст падпісалі: ад калгасу імя Сьвярдлова: КАНЧЫЦ ЦІМОХ, КРАСНАБАЕВА, АНТОНАЎ, БЕЛЯНКОЎ;

ад калгасу «Свабода»: ЖЫЛІНСКІ, ЯНУШОЎ, СМАЛЬГОЎ;

рэдакцыя газэты «Камунар»: МЕЕРЗОН, КУЛЯШОЎ.

СПЭКУЛЯЦЫЙНЫЯ ЗЬДЗЕЛКІ--ЗАМЕСТ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАГАТОВАК

СЛУЦАК.

У рабоце Слуцкай міжраённай канторы Белплодагароднины ў поўнай меры праявіліся факты разлажэньня загатоўчага апарату, ігнараваньня дырэктыў партыі аб савецкім і калгасным гандлі, зрыву цэнтралізаваных плянаў загатовак і спэкуляцыйна-гандлярскіх настроіў.

Міжраённая кантора павінна была ў першую чаргу выканаць заданьні па адгрузцы бульбы і іншай гароднины пралетарскім цэнтрам. Гэта дырэктыва ганебна парушана. Пры выкананьні цэнтралізаванага пляну адгрузкі бульбы на 10 кастрычніка на 17,2 проц., міжраённая кантора Белплодагароднины адгрузіла не па пляну, без нарадаў «Ленпищгорту» 63 тоны бульбы, транспартнаму спажывецкаму таварыству Кастрычніцкай чыгункі — 5,4 тоны, Белгандлю — 66 тон бульбы і інш. відаў гароднины.

Работнікі Слуцкай канторы ў першую чаргу адгружаць прадукты тым, хто «больш і лепш плаціць», ад каго можна атрымаць хутчэй прэміі і прамтавары. Навошка выконваць цэнтралізаваныя пляны загатовак, калі можна адгрузіць бульбу і гароднину розным загатоўшчыкам, якія дадуць добрую цану, якія не паскупяцца на падарункі.

Кіраўнік канторы **Непагодзін**, яго намесьнікі **Левін і Фарбэр** былі матар'яльна зацікаўлены ў разьвіцьці спэкуляцыйных зьдзелак за кошт цэнтралізаваных загатовак. Яны зьяўляліся «на сумяшчэньні» консультантамі па загатоўках у прадстаўніцтве Ленінградзкай канторы Плодагароднины, за што атрымлівалі па 300 руб. у месяц дадткова. Бухгальтары міжраённай канторы **Казюліч** (былы земскі начальнік), **Смальгоўскі** і экспэдыятар **Багдачыц** таксама працавалі ў Ленканторы і атрымлівалі там зарплату па 200 руб. у месяц.

Ленінградзкая кантора Плодагароднины, на чале якой стаяў упаўнаважаны, былы спэкулянт **Пастрон**, заахвочвала ішконьні работнікаў міжраённай канторы выконваць пляны загатовак сельгаспрадуктаў для розных арганізацый за кошт цэнтралізаваных нарадаў.

Транспартнае спажывецкае таварыства Кастрычніцкай чыгункі ўжывала форму скрытых хабараў. У сваім лісьце да Слуцкай міжраённай канторы яно паведаміла, што «абумоўлены тавар» і апрача таго 10 бочак селядцоў у адрас канторы замаскаваны. Гэты тавар быў атрыман, але па дакументах міжраённай канторы не прайшоў. Трэба думаць, што гэта была чарговая «прэмія», якая трапіла ў кішэню кіраўніку Слуцкай канторы. Гэтай справай павінна зацікавіцца пракуратура.

15 работнікаў міжраённай канторы за час асеньніх загатовак атрымалі прэмію ў разьмеры 1.300 руб. грашыма, 150 метраў рознай мануфактуры, два скураныя гарнітуры і, апрача таго, кіраўнік Непагодзін атрымаў дадаткова авансам у лік будучай прэміі 300 руб.

Як мы бачым, у рабоце Слуцкай міжраённай канторы Белплодагароднины панавалі спэкулянцкі, шэпманска-гандлярскі душок. Нават беглы агляд дакументаў, якія, да рэчы, знаходзяцца ў надзвычай хаатычным становішчы, наглядна ілюструе гэта. За бульбу адноўкавага гатунку, загатоўленай у адзін і той-жа дзень, плацілі адваму калгасу па 60 кап., а другому — па 20 кап. Нацэнкі на загатоўленыя прадукты рабіліся на прынцыпу — больш сарваць. Рэалізаваныя грыбы, якія загатаўляліся па 4 руб. 35 кап. кілё, адгружаліся па цане 10 руб. кілё.

Дагэтуль не ліквідавана запазычанасьць калгаснікам і аднаасобнікам па загатоўках. Толькі па адным пункце Шчыцкага сельсавету («Чырвоны будаўнік») ня выплачана за грыбы 1.050 руб.

Усе гэтыя агіднасьці маглі здарыцца толькі ў выніку адсутнасьці кантролю за работай міжраённай канторы, прытуленьня клясавай пільнасьці ў адносінах да варожых элемэнтаў, якія пралезьлі ў загатоўчы апарат.

Аб'яднанае бюро РК і прэзыдыуму РКК КП(б)Б пастанавіла зьняць з работы і аддаць пад суд Непагодзіна, Левіна і Фарбэра. Непагодзін выключан з радоў партыі.

Справа Слуцкай міжраённай канторы павінна паслужыць урокам для ўсіх іншых раёнаў БССР. Яна яшчэ раз паказвае на неабходнасьць узмацненьня клясавай пільнасьці ў адносінах да мажоўраў клясавага ворага па важнейшых участках нашай работы.

Брыгада «Зьвязды» — РАБЦЭВІЧ, БУГРОЎ.

Райспажыўсаюз узяў на буксір кантору плодагароднины

ВОРША, 29 (БЕЛТА).

У ВЫНІКУ ШЫРОКА РАЗГОРНУТАЙ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ, КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ — БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ АРШАНШЧЫНЫ СВАЯЧАСОВА ВЫКАНАЛІ ПЛЯН БУЛЬБАЗАГАТОВАК. АРШАНСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ ЯШЧЭ ДА 25 КАСТРЫЧНІКА ПОЎНАСЬЦЮ ЗКОНЧЫЎ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ. АДГРУЖАНА 2.538 ТОН.

ВЫКАНАЎШЫ СВАЕ ЗАДАНЬНІ, РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ УЗЯЎ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР КАНТОРУ ПЛОДАГАРОДНІНЫ І ДАПАМАГАЕ ЁЙ У ХУТЧЭЙШЫМ СКАНЧЭНЬНІ АДГРУЗКІ.

УПЕРАДЗЕ ПА АДГРУЗЦЫ ІДЗЕ ТУМІНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЯКІ УЖО ПЕРАВЫКАНАЎ СВАЕ ЗАДАНЬНЕ (ЗАМЕСТ 278 ТОН АДГРУЖАНА 286 ТОН). ПА-УДАРНАМУ ПРАВОДЗЯЦЬ ГЭТУ РАБОТУ ТАКСАМА МАЛАДНЯНСКІ, СЯЛЕЦКІ І БУДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ. У ГЭТЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ АДНААСОБНІКІ ЗНАЧНА ДАПАМАГЛІ Ў ВЫВАЗЦЫ БУЛЬБЫ СВАІМ ТРАНСПАРТАМ.

1-ы дзень міжраённага калгаснага кірмашу ў Менску

З самай раніцы, з усіх канцоў у горад пацягнуліся фурманкі. Калгасы, калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі зьехаліся на першы менскі міжраённы кірмаш.

У горадзе незвычайнае ажыўленьне. Вуліцы перапоўнены. Ля трамвайных прыпынкаў — вялізарныя чаргі. Асабліва ажыўленьне — на Камуналкай і Шырокай вуліцах, што прылягаюць да плошчы Парыскай Камуны, дзе адбываецца кірмаш.

На самым кірмашы кіпіць гандаль. Калгасьнікі людзь спрэўляюцца адпускаць прадукты і атрымліваць грошы.

Калгас імя Дзяржынскага прывёз у першы дзень 220 кгр. мяса, 100 кгр. сьвініны, 100 цэнтн. бульбы і шмат малочных прадуктаў. Апрача таго калгасьнікі прывезьлі гароднину са сваіх уласных гародаў, малочныя прадукты, яйкі, куры і інш.

Нацыянальны польскі калгас «Пяцігодка» прывёз тры цэнт. мяса, 9 цэнт. бульбы, 2 цэнт. капусты і інш. гароднину.

Калгасьнікі калгасу «Зьвязда» вывезьлі на міжраённы кірмаш 380 кгр. мяса, 500 літраў малака, 120 цэнт. бульбы, 10 цэнт. яблык, 20 шт. курэй.

Калгас «Чырвоны калгасьнік» прывёз 3.500 кгр. капусты, 10 гусей, два вазы з бульбай і шмат малочных прадуктаў.

Калгасы Дзяржынскага нацыянальнага польскага раёну даставілі мяса, бульбу, яблыкі і інш. прадукты.

Калгас імя Розы Люксэмбург вывез на продаж 80 трусоў з уласнай гаспадаркі. Трусы прадаваліся па цане ад 5 да 17 руб. штука.

І ўсё-ж трэба сказаць, што прадуктаў на кірмашы было-б у некалькі раз больш, КАЛІ-Б РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЛЕПШ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА КІРМАШУ. Трэба было павесьці шырокую масава-растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў, мабілізаваць іх на актыўны ўдзел у кірмашы. **Гэта работа, аднак, была разгорнута ў некаторых раёнах ВЕЛЬМІ СЛАБА.** За гэта вясуць поўную адказнасьць як раённыя арганізацыі, так і кірмашовы камітэт.

* * *

Цэны на сельска-гаспадарчыя прадукты ў першы дзень кірмашу былі вельмі нястойлівыя. Яшчэ раніцою бульба, напрыклад, прадавалася па 45-47 руб. за асьміну, а ў 11-12 гадзін яна прадавалася ўжо па 20-22 руб. за асьміну. Малако раніцою каштавала 2 р. 50 к.—2 р. 75 к. за літар, потым яно прадавалася з саўгасных і калгасных вазоў па 1 р. 25 к.—1 р. 50 к. за літар. Так, саўгас «Вольная праца» прадаў 1.000 літраў малака па 1 р. 50 кап. за літар. Гэты-ж саўгас прадаў 2 тоны бульбы па 45 к. кілёграм, 2 тоны капусты, 1 тону яблык і інш.

Калгас «Новы шлях», Рудзенскага сельсавету, прадаў тушу мяса па 10 руб. кгр. Калгас імя Фалько, Грычанскага сельсавету, прадаў 300 літраў малака па 1 р. 50 к. Гэты-ж калгас вывез на рынак мяса, бульбу і інш. прадукцыю.

Некаторыя калгасы, калгасьнікі і аднаасобнікі, якія вывезьлі прадукцыю, прадавалі яе на даволі высокіх цэнах. Але трымацца доўга не ўдалося. Пакупцы, даведаўшыся аб тым, што на іншых вазох мяса, бульба, малако прадаюцца значна таней, на турэльна ішлі туды. Тады прыходзілася зьнізіць цэны. Знайшліся «кансэрватары», якія ўпарта не жадалі ўступаць. Яны гадзінамі стаялі ля сваіх вазоў і сумна наглядалі, як жвава гандлююць іншыя калгасы і калгасьнікі.

Рознабой у цэнах між іншым тлумачыцца дрэннай арганізацыяй сувязі на самым кірмашовым пляцы.

Цэны на прадукты зьмяняюцца амаль кожную гадзіну. Неабходна палуцлрызаваць новыя цэны кожны раз на ўвесь кірмаш. І, аднак, кірмашовы камітэт канцэнтраваў толькі невялічкім шляхам, які разносяць прадстаўнікі рабочага кантролю па ўсім пляцы. Чаму нельга было выкарыстаць для гэтай мэты радыё? Чаму нельга было арганізаваць перадачу праз радыё-рупары новых цэн, якія складаюцца на кірмашы. Тут бязумоўна вялікая віна радыё-цэнтру, які ня зможаў арганізаваць актыўную дапамогу менскім арганізацыям у правядзеньні кірмашу. Гэту памылку яшчэ можна выправіць. І гэта неабходна зрабіць неадкладна.

І яшчэ адно недапушчальнае зьявішча. Кіраўнікі кірмашу ня здолелі арганізаваць належны парадак у расстаноўцы вазоў. Замест таго, каб строга распляноваць пляц, вызначыць паасобныя месцы для гандлю розным прадуктамі, кірмашовы камітэт дапусьціў поўны беспарадак у гэтых адносінах. Мяса, бульба, малако, капуста, трусы, яйкі і г. д. усё згрудзілася ў адным месцы — атрымалася мітусьня, неразьбярыха. Гэта між іншым не магло не адбіцца і на цэнах. Бо, калі-б, напрыклад, гандаль малаком праводзіўся ў адным месцы, гандаль бульбай у другім і г. д., цэны на прадукты перадаваліся-б знаўна хутчэй ад воза да воза.

Кірмашовы камітэт абавязан неадкладна ліквідаваць гэты недахоп, арганізаваць узорны парадак на кірмашовым пляцы.

С. ГАЛКІН.

У ПРАМТАВАРНЫХ ЛАРКОХ

Выгляд пляцу Парыскай Камуны незвычайны. Апрача ларкоў МГРК і Белкаапсаюзу, якія былі пабудаваны раней, выцягнуўся доўгі рад часовых павецяй прамысловых арцеляй, вырасьлі ларкі менскіх ЗРК, вандруюць на калёсах фургоны Белгандлю. Інакш выглядаюць і самі ларкі як знадворку, так і ў сярэдзіне. Плякатам і лёзунгам, якія «крычаць» аб сустрэчным патоку прадукцыі шырокага спажываньня ў поўнай меры адпавядае колькасьць тавараў у ларках. Польты, гарнітуры, сьвітры, плашчы, рубахі, боты, валёнкі, балеткі, вёдры, хамуты, вузьдзечкі, вяроўкі, калёсы, чайнікі, кружкі, патэльні, надковы, рыдлёўкі, пілы, сякеры, завесы—вось асноўны асартымэнт прамтавараў, якія былі выкінуты на менскі міжраённы калгасны кірмаш. Усё гэта мог атрымаць калгаснік і працоўны селянін—аднаасобнік па даступных цэнах.

Колькасьць тавараў і яго асартымэнт сьведчыць аб некаторай падрыхтаванасьці да кірмашу з боку гандлёвых арганізацый. Аднак, трэба адзначыць шмат арганізацыйных непаладак, якія перашкаджалі кірмашу наладзіць гандаль. Падамо прыклад. Ларок ЗРК мэталістаў перапоўнен рознастайнай прадукцыяй. Тут можна знайсьці добрыя сякеры, пілы, замкі, патэльні, вілкі, розныя скабяныя вырабы. Але памяшканьне ларка настолькі малое, што ў ім людзь таварачаецца работнік прылаўку. Прадукцыя па асартымэнтах не раскладзена. Усе тавары звалены ў адну кучу. У выніку пакупец бачыць толькі тое, што ляжыць зьверху. Аб астатнім-жа асартымэнце ён дазнаецца ад работніка прылаўку. А колькі патрэбна намаганьняў і часу, каб атрымаць патрэбны адказ пры такім вялікім натоўпе людзей каля ларку.

Цэнната і нераспарадчасьць у ларку пры водзяць да таго, што спажывец, які жадае, скажам, купіць нож для сячкарні, павінен чакаць, пакуль будуць праданы сякеры, бо апошнія ляжаць зьверху і загружаюць нажы.

Сам работнік прылаўку зусім некваліфікаваны ў гандлёвай справе. У яго няма тэй гібкасьці і наваротлівасьці, якая патрэбна з боку гандлёвага работніка.

Узорам таго, як ня трэба арганізоўваць сустрэчны гандаль прамтаварамі, зьяўляўся продаж гаспадарчага мыла ларком-фургонам № 2 Белгандлю. Галавацяны дайшлі да таго, што бязупынна разьяжджалі па кірмашу і не хаду праводзілі продаж, вёўшы за сабой натоўп пакупцоў.

Шмат агідных зьявішч можна было сустрэць і ў ларках прамысловых арцеляй. Некаторыя з іх выставілі прамтавары, а расцэнак не зрабілі.

— Колькі каштуе рубаха?—пытаюць пакупцы ў работнікаў прылаўку ларку прамарцелі «Пралетары».

— Ня ведаем, бо нам не далі расцэнак—адказваюць яны.

Пасьля такога адказу пакупец вылазіць і пойдзе назад ад ларку.

Фактаў арганізацыйных непаладак у падрыхтоўцы да кірмашу можна было прывесьці шмат, але і гэтых даволі, каб заваструць увагу гандлёвых арганізацый і ўсёй грамадзкасьці гораду. Астатнія дні кірмашу трэба праводзіць больш арганізавана, улічыўшы дадатныя і адмоўныя бакі першага дня.

Ф.

Практычнымі мерапрыемствамі адказваюць партыйныя арганізацыі на пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б)

Зараз-жа пасьля апублікаваньня ў друку, партыйныя арганізацыі як у горадзе, так і на вёсцы пачалі шырокую прапрацоўку пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б). Адначасова намячаюцца практычныя мерапрыемствы ў ажыцьцяўленьні дырэктыў пленуму.

Партыйныя ячэйкі фабрык і заводаў гор. Магілеву, ухваляючы пастанову пленуму, абавязаліся, яшчэ больш павысіць тэмпы вырабу рочаў шырокага ўжытку. На партыйным сходзе партколектыву швэйнай фабрыкі імя Валадарскага, дзе прапрацоўваліся дырэктывы пленуму, дзе шырока абгаворана работа уцільцэху. За 3-ці квартал па уцільцэху, які выробляе тавары шырокага ўжытку, праграма выканана на 122 проц. Выступаючыя на сходзе рабочыя заявілі, што іх не задавальняюць гэтыя тэмпы, што яны усё-ж павольны, параўнальна з тымі патрабаваньнямі, якія ставіць пленум перад краінай. Сход у сваіх пастановах абавязаўся яшчэ больш павысіць тэмпы вырабу шырокапажыву, патрабаваўшы ад адміністрацыі павялічыць лік рабочых уцільцэху, каб поўнасьцю выкарыстоўваць адыходы-вытворчасьці.

Партыйны калектыў гарбарні імя Сталіна, прыняў рад абавязкаў на яшчэ большым разгортваньні работы уцільцэху і паляпшэньні грамадзкага харчаваньня. Сход абавязаўся да вясны будучага году арганізаваць сваю ўласную харчовую базу, павялічыўшы на 100 проц. пагалоўе жывёлы на сьвінаадкормачным пункце пры заводзе.

Партыйная ячэйка рымарнай фабрыкі паставіла задачу павялічыць выпуск тавараў шырокапажыву на 25 проц. і дабіцца паляпшэньня рабочага забесьпячэньня. Партыйная ячэйка артэля «1 мая» абавязваецца ў 4-м квартале ліквідаваць недавыкананьне праграмы ў першых кварталах.

Выступаўшы па сходзе партактыву па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б тав. Рыжкіна аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б), прыводзілі рад фактаў скажэньня дырэктывы партыі загатоўчымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі. У адным з прыгарадных сельсаветаў прадстаўнік загатоўчай арганізацыі заключыў з калгасам дагавор на закупку яблык па 300 руб. за тону. У гэты-ж дзень прыяжджае другі загатоўшчык і дае за тону 1.000 руб. і нарэшце, у той-жа дзень, праз дзьве гадзіны, прыяжджае яшчэ адзін загатоўшчык і дае калгасу за тону яблык 1.000 руб. прычым 50 проц. гэтай сумы прантаварамі. Гэты факт сьведчыць аб тым, што нэпманскі душок у некаторых нашых загатоўчых арганізацыях яшчэ жывы, што яшчэ ёсьць выпадкі штучнага ўздуваньня цэн, канкуренцыі. Гэты нэпманскі душок трэба рашуча выгрупіць.

Другі прыклад. У 5 кілёмэтрах ад Магілева знаходзіцца Цішоўскі сельсавет. Ужо доўгі час калгасьнікі і аднаасобнікі дарэмна збіваюць порогі крам у гэтым сельсавеце за газай, якой ні ў адной краме няма, а ў горадзе яе колькі хочаш.

Шырока праведзена прапрацоўка пастаноў пленуму і ў віцебскай партыйнай арганізацыі. Пашыраны пленум гаркому, які заслухаў даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Іванова аднадушна ўхваліў дырэктывы пленуму, вынес рад мерапрыемстваў для зьнічэньня прарыву ў выкананьні прамфінпляну, аб якіх сьцьвярджала «Зьвязда» і, у прыватнасьці, аб папышэньні вырабу рочаў шырокага ўжытку.

«Лепшым адказам на рашэньне пленуму ЦК, — гаворыцца ў прынятай рэзалюцыі, — будзе поўная і свячасовая адпрузка бульбы пралетарам Ленінграду, выкананьне пляну збожжазагатовак да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі і 100 процантнае выкананьне зяблёва».

Пленум ГК падкрэсьліў, што тыя дасягненьні, з якімі краіна сустракае XV гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі, ёсьць вынік цьвёрдага, правільнага кіраўніцтва леніньскага ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, вынік барацьбы на два фронты, і аблюдыў пастанову прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з радоў партыі ўдзельнікаў контр-рэвалюцыйнай групы Руціна, Іванова, Галкіна.

Аналёгічнае рашэньне і рад практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні пастаноў пленуму вынесена і барысаўскай партыйнай арганізацыяй, якая абавязалася да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаць на 100 проц. пляны загатовак збожжа, бульбы, мяса і інш.

Так партыйныя арганізацыі практычнымі мерапрыемствамі, арганізацыяй новага вытворчага ўзьдыму працоўных, адказваюць на пастановы пленуму ЦК УсеКП(б).

***

Але яшчэ ня ўсе партыйныя арганізацыі мабілізаваліся на выкананьне пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК. Напрыклад, гомельская партыйная арганізацыя да 25 кастрычніка зусім ня бралася за прапрацоўку. Ні адна партыйная ячэйка не занялася гэтым пытаньнем да сходу партыйнага актыву арганізацыі, які адбыўся 22 кастрычніка.

Гэтай павольнасьці ў выкананьні важнейшых пастаноў партыі нельга цярпець. Кожная партыйная арганізацыя павінна праверыць, што зроблена ёю ў выкананьне дырэктыў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і мабілізаваць масы на поўнае і няўхільнае іх ажыцьцяўленьне.

М. С-кі.

Выправіць на-ходу недахопы партвучобы

Перад менскай, як і перад усёй партыйнай арганізацыяй Беларусі, стаіць выключна важная задача шырокага разгортваньня партвучобы, паляпшэньня якасьці марксыцка-леніньскага выхаваньня малодых членаў партыі, кандыдатаў, касамольцаў і шырокіх працоўных мас насельніцтва. Якасьць партыйнай вучобы павінна стаць у цэнтры ўвагі арганізацыі.

Але, на жаль, ня ўсе партыйныя арганізацыі Менску добра ўразумелі гэту важнейшую задачу. Многія і па сёньняшні дзень думаюць, што марксыцка-леніньскае выхаваньне гэта справа культпропу гаркому, райкому, што гэта ня ёсьць справа ўсёй партарганізацыі.

Інстытут Гіспарту, Рэвруху і Вышэйшая камуністычная сельска-гаспадарчая школа, якім было прапанавана Менгаркомам КП(б)Б яшчэ 15 жніўня г. г. вылучыць адпаведны лік прапагандыстаў для партсоткі гор. Менску, да гэтага часу не далі ні аднаго чалавека.

Партыйная вучоба па гор. Менску распачата 23 верасьня. Але належных вынікаў яшчэ няма. Партвучоба па ўсёй менскай арганізацыі праходзіць зусім неэдзіньняюча.

У Менску налічваецца 132 партыйныя школы, якімі ахоплена 6.235 асоб. З гэтага ліку: членаў КП(б)Б—1.897, кандыдатаў партыі — 974, камсамольцаў—806, беспартыйных рабочых і калгасьнікаў—2.412, жанчын—1.008. У пераважнай большасьці ўсе гэтыя школы не ўкамплектаваны прапагандыстамі.

У выніку гэтага сыстэматычна зрываецца партыйная вучоба па буйнейшых прадпрыемствах: заводзе імя Варашылава, «Бальшавік», «Кагуар», «Польная рэзаніцыя», «Настрычнік» і г. д. Але калі студэнты ВКСГШ на сваім агульным сходзе паведамілі загадчыку вучэбнай часткі тав. Агульніка аб тым, што неабходна дапамагчы фабрычна-заводзкім арганізацыям у марксыцка-леніньскім выхаваньні, дык тав. Агульнікаў сказаў:

— Хто хоча займацца прапагандай, той няхай ідзе ў прапагандысты, а хто хоча вучыцца, няхай вучыцца.

Такім чынам да сёньняшняга дня ВКСГШ не дала ні аднаго студэнта, або выкладчыка для партыйнай сеткі па марксыцка-леніньскім выхаваньні працоўных мас у гор. Менску. Месяц таму назад фармальна ў ВКСГШ было вылучана 80 прапагандыстаў. Але гэта засталося на паперы. Вылучаныя таварышы не праходзяць занятак у партшколах.

Ня лепш адносіцца да вылучэньня прапагандыстаў і Інстытут Гіспарту, які да сёньняшняга дня ня даў ні аднаго чалавека.

Сакратарыят Менгаркому КП(б)Б 10 кастрычніка на сваім пасяджэньні, паставіў на від бюро партколектываў і ячэек ВКСГШ і Інстытуту Гіспарта.

Дрэнна змагаюцца за пасьпяховае правядзеньне партнавучальнага году і некаторыя партколектывы прадпрыемстваў. Партыйны калектыў заводу імя Варашылава і рад іншых арганізацый да гэтага часу амаль не прыступілі да ўкамплектаваньня партшкол. На шчотачнай фабрыцы быў нават такі факт, калі старшыня таварыскага суда ў час заняткаў партшколы забраў усіх слухачоў, прапагандыста адправіў дамоў і пасьля гэтага праводзіў сваю работу. Такія здарэньні не зьяўляюцца выключэньнем. Некаторы сакратары парткалектываў злачынна недазапэньваюць марксыцка-леніньскую вучобу.

Марксыцка-леніньскае выхаваньне шырокіх працоўных мас насельніцтва павінна заняць важнейшае месца ва ўсёй партыйнай рабоце. Трэба памятаць, што выпрацаньне складаных палітычна-гаспадарчых задач, якія пастаўлены XVII партканфэрэнцыяй і верасьнёўскім пленумам ЦК УсеКП(б) у значнай меры залежыць ад таго, як пастаўлена марксыцка-леніньская вучоба, залежыць ад таго, як масы ўразумелі асноўныя задачы партыі і ўлады.

Марксыцка-леніньскае выхаваньне шырокіх працоўных мас трэба паставіць на належную вышыню. Менск у гэтым павінен паказаць найлепшыя ўзоры.

М. О. КАРОЛЬ.



ДОМЕННЫ ЦЭХ МАКЕЕЎСКАГА ЗАВОДУ (ДАНБАС).

Акад. С. Я. Вальфсон

Навука БССР за 15 год

Пануючыя клясы капіталістычнага грамадзтва карыстаюцца магутнай зброяй навукі для дасягненьня сваіх клясавых мэтаў. Буржуазія ўсіляк выкарыстоўвае сваё пануючае становішча для таго, каб ня даць свайму сьмяротнаму ворагу — пралетарыяту магчымасьці карыстацца гэтай зброяй. Буржуазія манапалізуе навуку ў руках, цес на зьвязаных з ёю груп спэцыялістаў, якія фальсыфікуюць навуку ў інтарэсах капіталізму. Буржуазія ставіць навуку на службу акцыянэрным таварыствам, трэстам, скарыстоўвае яе для новых імпэрыялістычных войнаў.

Рабочая кляса адносіцца да навукі зусім інакш. Пралетарыят зацікаўлен у тым, каб назапасіць рэчаіснасьць такой, якой яна ёсьць не скажонай ніякімі мерказьнымі ідэалягіямі і барышніцтва. Пралетарыят штурмуе стары сьвет пад сьцягам навуковага сацыялізму.

Царызм, верны сваёй калёнізатарскай і русіфікатарскай палітыцы, ня мог дапусьціць існаваньня на Беларусі вышэйшай школы.

Вышэйшая школа па Беларусі ўзьнікла толькі пры дыктатуры пралетарыяту. Яна змагла разгарнуцца выключна ва ўмовах пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва. У першую гадавіну вызваленьня БССР ад беларускай акупацыі — 11 ліпеня 1921 году — была заснавана першая вышэйшая школа на Беларусі — Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт.

Пастанова аб стварэньні унівэрсытэту была прынята партыяй і ўрадам Савецкай Беларусі праз некалькі месяцаў пасьля вызваленьня рэспублікі ад акупацыі. Уся Беларусь яшчэ крывавіла шматлікімі ранамі нанесенымі ёй акупантамі.

У такіх умовах трывець пастанову аб стварэньні унівэрсытэту маглі толькі партыя і ўлада клясы, якая ўсьвядомла ўвесь гістарычны сэнс сваёй перамогі, якая мела перад сабой перспэктыву абумоўленага гэтай перамогай гіганцкага будаўніцтва.

Ворагі, залгалі, што бальшавікі пад выглядам унівэрсытэту будуюць звычайную школу савецкай палітграматы, і што гэта школа таксама недоўгавечна, як і ўсё бальшавіцкае... Абыватэлі сьміяліся над тым, што савецкая ўлада «ня малочы штацюў, хоча насіць цылядар». Апартуністы бакалі ўказвалі, што ў нас няма навуковых кадраў, ці навучальнага абсталяваньня, ні патрэбных сродкаў, і справа канчацца нічэм.

Партыя адкінула варожыя і апартуністычныя пярэчаньні. У БССР быў пабудован беларускі дзяржаўны унівэрсытэт, як першая вышэйшая школа, як першы навукова-дасьледчы цэнтр рэспублікі, якая пачала будаваць культуру нацыянальную па форме, пралетарскую па зьмесьце.

Клясавы вораг скіяў клясавым пачуцьцём адчуў, што стварэньне беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту будзе вялізнай перамогай савецкай улады, будзе буйнейшай трачыстасьцю леніньскай нацыянальнай палітыкі. І ён усіляк прабаваў перашкодзіць гэтай перамозе, усіляк імкнуўся скампрамэтаваць БДУ ў вочах шырокіх працоўных мас.

Вялікадзяржаўныя шавіністы зубгаталі навет таго, што бальшэвікі збіраюцца будаваць унівэрсытэт на «чужыцкай мове». Нацыямы пакрывалі адсутнасьцю ў БДУ «шчырай беларускасьці».

Унівэрсытэт прыходзілася ў пачатку будаваць рукамі амаль адных толькі старых навуковых працаўнікоў. Сярод гэтых кадраў аказалася і даволі значнае «прадстаўніцтва» клясавага ворага. Унівэрсытэт бачыў на сваіх катэдрах і контр-рэвалюцыянэраў, скарыстаўшых свой пераезд у Менск пад выглядам «бегу ад пераканцуцца ў белую эміграцыю—Озіярман, Лянсцкій; чорнасоценцаў-вялікадзяржаўнікаў розных колераў ад Сапічаў да Пармёнавых; яўрэйскіх клерыкалаў тыпу Марыонаў, які гаварыў ад імя «пастаўленых» на савецкую плянформу навуковых работнікаў; беларускіх нацыямаў — Лёсікаў і Карабайчыкаў, якія прабавалі атруціць студэнцтва контр-рэвалюцыйным шавінізмам; бачыў людзей, што спэкулявалі на пашане савецкай улады да работнікаў навукі.

На ліквідацыю, такіх было нямнога. Контрэвалюцыянэраў, шкодзікаў, клерыкалаў, старожымных чынуш сярод навуковых работнікаў былі за гэтыя гады адкінуты. Маса-ж навуковых работнікаў добрасумленна і самаадданна працавала на пабудову вышэйшай школы Савецкай Беларусі, на стварэньне кадраў для сацыялістычнай гаспадаркі і культуры. Многія з іх працавалі ў сапраўдным значэньні гэтага слова—гераічна, паказаўшы сябе энтузіястамі лябараторыі і катэдраў, габінэтаў і клінік, якія яны стваралі і будавалі як сапраўдныя ўдарнікі, натхнёныя патасам нашага будаўніцтва.

***

Будаўніцтва вышэйшай школы разгорталася вялізарнымі тэмпамі. Ужо ў 1925 годзе БССР мела 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы, у 1930 годзе — 10, у 1931 г. —12 і да 15-й гадавіны Кастрычніка мы плянуем в 32 ВНУ, у якіх навучаецца 15.132 студэнтаў.

Прапарцыянальна колькасьці інстытутаў лік студэнтаў па БССР значна вышэйшы, чым у перадавых нават капіталістычных краінах. Так, у Нямеччыне на 10.000 насельніцтва налічваецца 18 студэнтаў ВНУ, у Англіі — 14, ва Францыі — 7,8, мы-ж маем па БССР 30 студэнтаў ВНУ на кожныя 10.000 насельніцтва.

Побач з ВНУ разгарнулася і шырокая сетка тэхнікумаў. Калі першыя намячэньні пяцігодкі плянавалі да канца 1932 году па БССР 37 тэхнікумаў з 9.850 студэнтамі, дык мы маем зараз 130 тэхнікумаў, у якіх навучаецца 32.198 студэнтаў. Сярод тэхнікумаў — 35 індустрыяльных, 32 педагагічных, 30 сельска-гаспадарчых, 11 сацыяльна-эканамічных і інш. Тут-жа трэба назваць ліквідацыю — 61 рабфак, на якіх рыхтуецца да вышэйшай школы 15.760 студэнтаў — рабочых і сялян.

Мы маем ня толькі колькасныя дасягненьні ў галіне вышэйшай і сярэдняй асьветы. Побач з колькаснымі мы маем і буйныя якасныя дасягненьні. Яны ў тым, у першую чаргу, што ўся работа нашай вышэйшай школы цесна зьвязана з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, што яна рыхтуе спэцыялістаў сацыялістычнай гаспадаркі і культуры, што яна зьяўляецца тэй кузьняй, праз якую ажыцьцяўляецца выснутая тав. Сталіным гістарычная задача стварэньня ўласнай вытворча-тэхнічнай інтэлігэнцыі работае клясы. Нашы ВНУ пацьвярджаюць словы т. Сталіна: «калі раней пры капіталізьме вышэйшыя навучальныя ўстановы зьяўляліся манаполіяй барчукоў, то зараз пры савецкай уладзе рабоча-сялянская моладзь складае там пануючую сілу».

Вось некаторыя даныя аб сацыяльным складзе студэнцтва БССР да пачатку 1932 году: рабочых — 49,2 проц., сялян — 23,4 проц., служачых — 25,3 проц., іншых — 2,1 проц. Партыйна-камсамольская прослойка ВНУ — 53,4 проц. Мы налічваем ужо дзесяткі рабочых і бяднейшых сялян, якія ад варштату і сахі прыйшлі ў рабфак, праз яго ў ВНУ, а зараз вядуць навуковую работу.

Выкладаньне ў нашых ВНУ вядзецца зьвыш чым на 80 проц. на беларускай мове. Нацыянальны склад студэнцтва: беларусаў — 76,6 проц., яўрэяў — 15,9 проц., рускіх — 3,4 проц., палякаў — 1,8 проц. і іншых нацыянальнасьцяй — 2,3 проц.

***

Адкак, побач з буйнымі дасягненьнямі мы маем на фронце вышэйшай школы сур'ёзныя недахопы, на зьнічэньне якіх партыя і ўрад зьвярнулі асаблівую ўвагу. Яшчэ не ліквідаваны ў нашай вышэйшай школе элементы мэтадычнага пражэкцёрства. Яшчэ да гэтага часу мы ня маем па большасьці дысцыплін праграм, якія-б адпавядалі профілю рыхтаваных спэцыялістаў. У цэлым радзе выпадкаў мы ня маем навет і самога гэтага профілю. У нашай сетцы ВНУ назіраецца шкодны паралелізм. Ёсьць рад буйных скажэньняў у ажыцьцяўленьні бесьперапыннай вытворчай практыкі. Усё гэта патрабуе разгорнутай, напружанай работы па зьнічэньні недахопаў нашых ВНУ. Вакол вырашэньня гэтых задачы павінны быць мабілізаваны шырокія масы нашых навуковых працаўнікоў, а таксама пралетарскае студэнцтва. Мы ставім задачы з тым, каб вышэйшая і сярэдняя школа БССР была ўзьнята на тую якасную ступень, якой патрабуюць дырэктывы партыі і пастановы ўраду.

Будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне характарызуецца найвялікшым пахопам навукі ў справу. У гранічэньнях мінтабах ажыцьцяўляецца леніньская дырэктыва: «Злучыць апошнія слова навукі, канцы сьвядомых работнікаў, якія творць буйную сацыялістычную вытворчасьць». У Савецкім саюзе навука ўпершыню ў гісторыі чалавецтва разьвіваецца ад улады капіталу, робіцца вялізарным фактарам пабудовы камуністычнага грамадзтва.

Да рэвалюцыі на тэрыторыі сучаснай БССР зусім ня было навукова-дасьледчых устаноў. Гэта цалкам адпавядала вялікадзяржаўна-калёнізатарскай палітыцы царызму, сканцэнтраваўшаму тры чвэрткі ўсіх навуковых устаноў расійскай імпэрыі ў двух гарадох: С.-Пецярбурзе і Маскве. Ня прыхоўваюцца гаварыць аб тым, што ўрад паменшыкаў і капіталістаў перашкаджаў якой бы там ні было навукова-дасьледчай працы на «акраінах», у адносінах да якіх царыцкі ўзвяк прапіла — русіфікаваць і эксплёатаваць.

Беларускі дзяржаўны унівэрсытэт быў ня толькі першай вышэйшай школай, але і першай навукова-дасьледчай установай БССР.

У лябараторыях, габінэтах, клініках малацота унівэрсытэту хутка пасьля яго заснаваньня пачала разгортвацца сур'ёзная навукова-дасьледчая праца.

Побач з унівэрсытэтам пачаў разгортваць навукова-дасьледчую працу, галоўным чынам, у галіне сельскай і лясной гаспадаркі менскі сельска-гаспадарчы інстытут імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Першай установай, арганізаванай у БССР выключна з навукова-дасьледчымі функцыямі зьявіўся інстытут беларускай культуры (Інбелкульт).

Адначасова ўзьнікаюць у БССР перыферыйныя дасьледчыя арганізацыі ў галіне сельскай гаспадаркі, як, напрыклад, Палеская дасьледчая станцыя (1925), лясная дасьледчая станцыя (1926). Нарэшце, у 1927 г. быў заснован навукова-дасьледчы інстытут імя Леніна з аддзеламі лясной гаспадаркі, мэліярацыі і культуры балот, сельска-гаспадарчай эканомікі і аграрнай палітыкі.

Да 10-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі

АГРАНОМЫ ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ УЗОР БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫСОКІ УРАДЖАЙ

Дэкада ўраджаю і калектывізацыі

МТС—НА ПЕРАДАВУЮ ЛІНІЮ!

Сёньня чацьверты дзень дэкады ўраджаю і калектывізацыі. Між тым пераважная частка МТС па-баявому ня ўключылася ў дэкадзнік, ня стала застрэльшчыкам у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, не выяўляе вопыту перадавых калгасаў, не пераносіць яго ў адстаючыя гаспадаркі.

«Машына-трактарныя станцыі павінны стаць кіраўнікамі калгасаў ня толькі ў галіне ўжываньня трактарнай тэхнікі, але і ў галіне АГРАНАМІІ», — такую задачу паставілі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР перад кожнай МТС.

Трэба скарыстаць дэкаду для таго, каб увесь агратэхнічны пэрсанал МТС сапраўды па-баявому пераключыўся на ажыцьцяўленьне важнейшай пастановы партыі і ўраду.

Дапамагчы распрацаваць тып севазвароту, стварыць і захаваць насенныя фонды, правільна разьмеркаваць даходы, паладзіць агратэхвучобу, навучыць калгасьнікаў ужываньню ўсёй сумы аграмерапрыемстваў, якія даюць павышэньне ўраджайнасьці — вось задача кожнага агранома. Яна з гонарам можа быць выкананая.

Дэкада павінна даць штурмшок па ліквідацыі прарыву на зяблеве, якое зьяўляецца адным з важнейшых аграмерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці. І тут МТС адстаюць. **На 25 кастрычніка плян выкананя на 34,4 проц.** Яшчэ не зазяблена 232 тыс. га.

З 57 МТС толькі адна **Рагачоўская** свячасова скончыла зяблеўку, выканаўшы да 20 кастрычніка сваё заданьне на 107,7 проц. У той-жа час 14 МТС не дасягнулі нават і 20 проц. Гэта значыць, што яны проста сарвалі выкананьне важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Факты гаворыць аб тым, што на зяблеве ня поўнасьцю скарыстоўваецца конская цягавая сіла, зусім дрэнна працуе трактарны парк. Адсюль, як вынік, адставаньне, прарыў. Людзі, якія кіруюць МТС, у першую чаргу ў гэтым вінаваты. Дырэктары МТС яшчэ не навучыліся канкрэтна кіраваць вытворчымі вучасткамі.

Астатнія дні дэкады ўраджаю і калектывізацыі трэба скарыстаць для ўзмацненьня тэмпаў зяблеўкі. Увесь трактарны парк і 70 проц. конскай цягавай сілы — на ворыва! Хто ня выконвае гэтай дырэктывы партыі, той робіць простае злачынства, той не ўсьвядоміў усёй сутнасьці пастановы СНК і ЦК ад 29 верасьня аб павышэньні ўраджайнасьці.

Да Кастрычніцкіх сьвят МТС БССР павінны выйсьці на перадавую лінію, рапартаваць ЦК і СНК аб 100 проц. выкананьні пляну зяблеўкі, аб намечаных канкрэтных мерапрыемствах па павышэньні ўраджайнасьці ў першым годзе другой пяцігодкі.

Захаваць насеньне да вясны

Свячасовая і старанная падрыхтоўка насеньня да вясны — адна з важнейшых умоў у справе павышэньня ўраджайнасьці. На гэта зараз павінна быць зьвернута ўвага партарганізацый і земельна-калгасных органаў.

Усё насеньне, якое вызначана для веснавой сяўбы, павінна быць перш-на-перш поўнасьцю адсартавана. Для гэтай мэты трэба поўнасьцю скарыстаць збожжаачышчальныя машыны (трыеры, сартыроўкі), якія ёсьць у саўгасах і калгасах.

Пытаньне збожжаачысткі трэба зараз-жа паставіць перад калгаснымі вытворчымі брыгадамі, зацікавіць іх у добраякаснай ачыстцы з тым, каб лепш узьняць ураджайнасьць.

Усьлед за ачысткай калгасы і саўгасы абавязаны зрабіць абеззараджаньне насеньня ад галаўні. Галоўнёй ці сажай хварэюць авёс, ячмень, пшаніца, жыта, проса і кукуруза.

Заражаныя гэтай хваробай культуры даюць зьніжэньне ўраджайнасьці на 10—15 проц. Гэта абавязвае кожны калгас і саўгас барацьбу з галаўнёй уключыць у лік абавязковых агратэхнічных мерапрыемстваў.

Для правільнага правядзеньня работ па пратручваньні насеньня калгасы абавязаны вылучыць спэцыяльных людзей. Брыгадзіры павінны пабываць на раённых курсах, бліжэйшых машына - зьнішчальных станцыях, або быць добра праінструктаваны агранамі.

Можа здарыцца, што ў калгасах няма пратручвальнікаў (фармазіну, прэпарату АБ, парыскай зелені і інш.). У даным выпадку пратручваньне можна правесьці прасьцейшымі спосабамі. З боку НКЗБ і цэнтральнай машына-зьнішчальнай станцыі трэба даць раёнам належныя ўказаньні і інструкцыі аб правядзеньні гэтай работы.

Ачысткай і пратручваньнем насеньня яшчэ не канчаецца яго падрыхтоўка да вясны. Пробаваньне на ўсхожасьць праз прарошчваньне павінна быць зроблена кожным калгасам.

Выключную ўвагу трэба зьвярнуць на ахову насеньня ад раскрадваньня, псаваньня, пажараў і г. д. Вылучыць найбольш надзейных калгасьнікаў спэцыяльнымі вартаўнікамі для аховы хавальнікаў насеньня.

Вельмі часта на правільнае хаваньне насеньня не зьвяртаюць ніякай увагі. Вільготнае зерня заўжды трэба захоўваць асобна ад сухога. Пры хаваньні ў засеках таўшчыня пласту не павінна перавышаць 3—3,5 мэтраў. Пры хаваньні ў тары, мяшкі укладваюцца тройкамі або пяцёркамі, у правільныя рады і штабелі.

Усе моманты падрыхтоўкі насеньня (ачыстка, пратручваньне, прарошчваньне і догляд), а таксама добрая ахова яго, зьяўляюцца важнейшай часткай падрыхтоўчай работы калгасаў да вясны.

В. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Ураджай пшаніцы—112 пудоў з га

ГОМЕЛЬ (Наш кар.). Агародны калгас «Шлях да сацыялізму», Прудаўскага сельсавету, мае значныя дасягненьні ў справе барацьбы за высокі ўраджай. З боку калгасьнікаў ёсьць вялізарная зацікаўленасьць да пытаньняў агратэхнікі і культурнага вядзеньня гаспадаркі.

Старанными адносінамі да апрацоўкі глебы, падкладкай гною пры пасадцы, свячасовым акучваньнем калгас атрымаў добры ўраджай капусты. Качан яе важыць 15-20 фунтаў.

Культурнае вядзеньне гаспадаркі дало магчымасьць пры пасеве нізкагатункавым насеньнем гуркоў атрымаць усё-ж даволі значны ўраджай. З 5-ці засеяных гэктараў калгас сабраў 33 тоны. Ураджай бульбы з га ў калгасе складае 650 пудоў, у той час, як у суседніх калгасах 400. **Ураджай пшаніцы—112 пуд з га.**

Старшыня калгасу «Шлях да сацыялізму» Пагаранскі нямала працаваў над тым, каб дабіцца высокага ўраджаю. У яго калгасе ўпершыню пачаў працаваць палольнік яго ўласнага вынаходзтва. Пагаранскі не дапушчае абыякай апрацоўкі глебы, праполкі і ўгнаеньня. Якасьць—першае яго запатрабаваньне.

Калгасьнік **Шаўцоў Якуб**, каб забясьпечыць свой калгас высокакатунковай капустай, у конкаўгасе дастаў 2·25 качанаў раньняй капусты № 1 1 пасадзіў яе. Потым ён сабраў 2½ пуд. лепшых гатункаў капуснага насеньня «Брашнівэй» і «Магера».

Шаўцоў адабраў лепшыя чыстыя гатункі памідораў і зараз думае ўвесьці ў сваім калгасе пасеў цукровых памідораў. Для гэтай мэты ён ужо дастаў 400 грам насеньня.

У калгасе ёсьць і рад іншых ударнікаў, як **Н. Шутаў, Цярэшчанка Р.**, якія таксама спрыяюць узьдыму ўраджайнасьці і ўмацаваньню калгаснай гаспадаркі.

Н. Гасман.

Выкарыстаць верас на корм

БРУЦКІ. Кармовы баланс на 1932-33 год зьяўляецца вузкім месцам у малочна-таварных фэрмах. Пры праверцы становішча забясьпечанасьці кармамі жывёлы ў калгасах «Бальшавік» і «Прач саха» выяўлен недахват грубых кармоў — у першым 24 тоны, у другім — 19 тон. Пры ўмове поўнага выкарыстаньня жытняй саломы, корму ўсё роўна ня хопіць. Ня лепш справа стаіць і па радзе іншых калгасаў.

Чым тлумачыцца недахват грубых кармоў? — Адсутнасьцю бальшавіцкага змаганьня за сілас і наогул за стварэньне кармовай базы з боку праўленьня калгасаў, сельсаветаў, парт'ячэек і МТС. Узорам «благодушшя» МТС можа служыць тое, што ў калгасе «Полымя», Крупскага сельсавету, сланэчнік, насеяны на сілас, да гэтага часу ня ўбраны і зьмёрз, у той час як справа з кармамі ў гэтым калгасе стаіць надта дрэнна.

Ігнаруюцца мерапрыемствы па паляпшэньні сенажацяй. Адсутнічае ўлік, не складаюцца пасьля выкананьня пляну загатовак кармовыя балянсы ў калгасах на патрэбную ім колькасьць грубых кармоў для ўтрыманьня ў стойлавы пэрыяд жывёлы. Усё гэта ставіць пад яўную пагрозу КТФ. Адгэтуль, як вынік, падзёж жывёлы, недабор прадукцыі, павялічэньне ліку ялавых матак і г. д.

Зараз трэба прыняць тэрміновыя меры да забесьпячэньня жывёлы грубымі кармамі. Папярэдзіць бясхорміцу. Выкарыстаць верас на сена. У лясных раёнах даўно заўважана, што жывёла (каровы і авечкі) пры наступленьні першых восеньскіх замаразкаў ахвотна паядае верас, які ня мае шкоднага ўплыву на здароўе і прадукцыю жывёлы.

Колькі-ж можна сабраць па работу верасовага сена? У сваёй большасьці на раёну сасновыя лясы. Плошча іх складае 85 тыс. га, з іх ня менш 10 тыс. га лесу з верасовым пакровам.

Улічваючы збор верасовага сена з га ня менш тоны, можна па раёну мець 10 тыс. тон дадатковага грубага верасовага корму. Верас можна ўбіраць на сена да той пары, пакуль ён зусім не пакрыецца сьнегам.

Калгасы, якія далёка знаходзяцца ад лясных верасовых масываў, павінны вылучыць спэцыяльныя брыгады для загатоўкі верасу на сена. Верас можна складаць у стагі пад хвоямі без усякай прасушкі, пакрыць толькі зьверху ялавымі лапкамі. Пры добрай дарозе калгас зможа забясьпечыць перавозку верасу ў гаспадарцы.

Вольскі.

З фронту зяблёва

БЕШАНКОВІЧЫ. Па АСТРАВЕНСКІМ сельсавеце трэба зазяблець звыш 400 га. На 26 кастрычніка ўзарана толькі 3 га. Зусім не прыступілі да зяблёва калгас «ЧЫРВОНЫ ПУЦІЛАВЕЦ». Старшыня гэтага калгасу СУХОЦКІ пітарэльна бязьдзейнічае. Райком і РВК на прарыў Астравіцкага сельсавету не рэагуюць.

С. КАЛІНА.

***

СЛУЦАК. Калгас «ЧЫРВОНА-ГРЫВЕНЬ» поўнасьцю скончыў оўбу азімых і зяблёва. Выканан плян загатовак амаль па ўсіх відах. Посьпехі дасягнуты ў выніку правільнай арганізацыі вытворчых брыгад, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўніляўкі. Лепшыя ўдарнікі калгасу: ЖУК МІКОЛА, КІШ ТАРАС, ДЗЯМІДЧЫК СЬЦЯПАН, ЖУК АКСЕНЯ і КІШ МАНЯ.

Чырвонаармеец ПЫКО.

***

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. На 25 кастрычніка па раёну зазяблена 45 проц. да пляну. Асабліва адстаюць сельсаветы: МІЛАШЭВІЦКІ — 2,7 проц., ГРЭБЯНЕЎСКІ — 7,1 проц., БАРАЎСКІ — 8 проц. Райком яшчэ не навучыўся канкрэтна кіраваць. Адстаючыя вучасткі не падтрымаюцца на ніякі перадавых.

С. Рэзэ.

***

ПЛЕШЧАНІЦЫ. На фронце зяблёва яўны прарыў. Па раёне плян выкананя на 26,1 проц. Райком на здолеў наладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай важнейшай кампаніі. Конская цягавая сіла на зяблёва ня выкарыстоўваецца. Старшыні калгасаў: «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ», «АСЬВЕТНІК», «ВОЛЬНЫ ШЛЯХ» і ІМЯ БУДЗЁННАГА адкрыта заўпяюць: «Пакуль МТС не дашле трактары, зяблёць ня будзем».

Мозыр.

П. Мятла

„БУРСА ім. ГАЛУЎКІ“

Пад такім загалоўкам надрукаваў відомым віленскім манархістам Мацкевічам у «Слове» артыкул.

Ня прыходзіцца дзівіцца, што акупацкая прэса час-ад-часу вымушана пісаць аб беларускіх справах, як ня прыходзіцца дзівіцца варожаму тону і цынізму ў справах усялякіх праяўленьняў беларускага нацыянальна - вызваленчага руху. Гэта амаль штодзённая брахня буржуазнай прэсы ўжо добра відома працоўным Заходняй Беларусі. Таксама беларускім працоўным масам добра відомы пан Міцкевіч, як аўтар цэлага раду артыкулаў, выяўляючых палітыку польскага фашысцкага ўраду, накіраваную супроць беларускай школы і культуры, супроць беларускага нацыянальна - вызваленчага і рэвалюцыйнага руху. Гэты манархіст адрозьніваецца ад раду яму падобных Студынцкіх і Абстаў хіба тым, што больш адкрыта гаворыць аб намерах акупантаў у справе палёнізацыі Заходняй Беларусі, яшчэ больш яскрава выказвае аблічча і намеры фашыстаў на Заходняй Беларусі.

Гаворачы аб пагромным распараджэньні польскай школьнай улады ў справе ліквідацыі апошніх беларускіх гімназій у Вільні і Навагрудку, ён даказвае, што «частуды гімназіі (беларускія) існавалі выключна таму, што мелі ўрадавыя субсыдыі і што беларускае грамадзянства ня можа ўласнымі сілакі ўтрымаць новай адной гімназіі».

Зразумела, што гэта чарговая брахня акупанцкага пісакі выцякае не з таго, што ён ня ведае сапраўднага становішча рэчаў, а з жаданьня апраўдаць дзікае цкаваньне і зьнішчэньне беларускага школьніцтва. Пан Мацкевіч вельмі добра ведае, што да 1928 г. ні адна беларуская гімназія не атрымлівала ад акупантаў ні граша дапамогі, а ўтрымлівалася на сродкі працоўнага насельніцтва Заходняй Беларусі і што тыя падачкі, якія ў апошнія гады кідаліся акупантамі сваім дзекам—Астроўскаму і К-° у разьмеры 4—5 штатных выкладчыцкіх адзінак для Віленскай і Навагрудзкай гімназій, былі на што іншае, як толькі адзін з многіх спосабаў заплаты за здрадніцкую работу нацыянал-фашыстаў.

Ён таксама добра ведае, што з ініцыятывы Навагрудзкай акруговай управы ТБШ, шляхам падпіскі сабраны былі сродкі на набудову гмаху Навагрудзкай гімназіі. Гэты гмах, дзякуючы ахвярам і фізычнай працы вучняў і працоўнай моладзі Навагрудчыны, ледзь не закончан.

Але пабратымцы пана Мацкевіча, беларускія нацыянал-фашысты, захапіўшы ў свае рукі Навагрудзкую беларускую гімназію, сарвалі набудову. Яны ашуквалі працоўнае насельніцтва, абяцаючы ім атрымаць дапамогу на набудову ад беларускага фашысцкага ўраду. За сваю працу на зрыве набудовы беларускай гімназіі і бурсы, за дапамогу акупантам ліквідаваць беларускае школьніцтва, за барацьбу супроць нацыянальна - вызваленчага руху — нацыянал-фашысты, зразумела, накрыўджанымі ня былі, але школьны будынак Навагрудзкай беларускай гімназіі так і стаяў незакончаным.

Сёньня, пасьля ліквідацыі Навагрудзкай беларускай гімназіі, акупанты захапілі і незакончаны (выведзены пад страху) будынак гэтай гімназіі, будаваны крывавым мазалём школьнай моладзі і на сродкі беларускіх працоўных мас Заходняй Беларусі.

З паведамленьня фашысцкай прэсы мы даведаемся, што пры польскай Навагрудзкай гімназіі існуюць так званыя беларускія паралельныя клясы і што на шыльдзе бурсы пакінут надпіс «беларуская», да якога дадаецца яшчэ выраз «бурса ім. Галуўкі».

Каб увядзіць слабе ўвесь цынізм і подласьць акупантаў, трэба ведаць, хто такі Галуўка.

Гэта быў свайго роду беларускі Мураўёў. Праўда, ён ня быў адміністратарам і непасрэдна не падпісваў загадаў вешаць рэвалюцыйных і нацыянальна - вызваленчых барацьбітоў, але ён быў ідэолёгам і асноваложнікам новых мэтадаў барацьбы з нацыянальна-вызваленчым рухам беларусаў і украінцаў, гэта яго быў сказ, што «беларусы, якія жывуць у Польшчы, пры ўмелай палітыцы, могуць зьліцца і растварыцца ў польскай нацыі».

Галуўка летась быў забіты на Заходняй Украіне, як адзін з палёнізатараў і фашызатараў, але яго пляны, яго палітыка зьнішчэньня беларускай культуры і школьніцтва, палітыка шыбеніц на Зах. Беларусі і Зах. Украіне праводзіцца акупантамі.

І назваць пасьля гэтага беларускую, хоць-бы нават толькі па назве, бурсу імем найгоршага ворага беларускіх і украінскіх працоўных мас — ёсьць звыніцынізмам, на які здольны толькі агалцелы акупант.

Усе гэтыя мазаўры і цынізм фашыстаў становіцца з кожным годам больш грубым, больш выразна адчуваецца плянавасьць у справе паходу супроць усяго нянольскага.

Мы бачым, што ў апошні час створана новая група, якая складаецца з паслоў і сэнатараў клюбу ББ з Віленшчыны і Навагрудчыны. Знайшліся нават сярод іх і такія чатыры асобы, якія гатовы называць сябе «беларусінамі». На чале гэтай групы стаў нейкі Шыманоўскі, які ў сваім «выказе» так акрэсьлівае будучую работу гэтай групы: «супрацоўнічаць з урадавымі групамі ў справе «ўпанствованьня» беларускіх гімназій, заняцца лёсам пабудовы бурсы пры гімназіі ў Навагрудку і апрацоўваньнем пляну выдавецтва на беларускай мове».

Заданьне, як бачым, невялікае, але «пачэснае»: ліквідаваць рэшткі беларускага школьніцтва, весьці барацьбу супроць беларускай культуры і навукі, пры дапамозе газэтнай шматы, якую маюць выдаваць аж у Баранавічах, ну і зразумела, прадстаўляць і «бараніць» гэтых «беларусінаў» за мяжой і ад іх імя прыносіць падзяку акупантам за лес шыбеніц, якія пакрылі сёньня Заходнюю Беларусь, за зьнішчэньне асьветы і культуры, за катаваньне дэфэнзывы і турам, за зьдзекі і гвалты, якія пануюць на акупаваных землях.

Гэта нова-арганізаваная фашысцкая група з урадавага блёку зьяўляецца выяўленьнем новых патуг фашызму да фашызацыі і палёнізацыі, а таксама ўзмацненьнем акупацыі Зах. Беларусі, як плацдарму будучай вайны супроць Савецкага саюзу.

Гэтых спадкаберцаў Валэйшы і Паўлюкевіча і шапечнікаў беларускіх нацыянал-фашыстаў чакае доля іх папярэднікаў.

Беларускія працоўныя масы на горкіх і цяжкіх вопытах навучыліся адразу пазнаваць новы твар фашызму, якую-б афарбоўку ці назву ён ня прымаў.

Яны пераканаліся, што адзіны шлях да сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня — ёсьць шлях рэвалюцыі і шлях рашучай барацьбы, разам з польскім пролетарыятам і рэвалюцыйным сялянствам за Кастрычнік у Польшчы, за самавызначэньне Заходняй Беларусі аж да адзяленьня.

Рэвалюцыйная хваля змые як свой нацыянал-фашысцкі, так і паносны акупантамі панскі бруд.

Напярэдадні Кастрычніцкіх сьвят

Гомельскія чыгуначнікі ператвараюць абавязацельства ў справу

Бальшавіцкай барацьбой за рэалізацыю ўзятых на сябе прадкастрычніцкіх абавязацельстваў гомельскія чыгуначнікі дабіліся раду посьпехаў.

Паляпшэньне якасьці рамонту забясьпечыла зьніжэньне процанту хворых паравозаў па чыгуначнаму раёну да 11 проц. у верасьні, супроць 1,4 у жніўні. У першай дэкадзе кастрычніка ёсьць яшчэ большае зьніжэньне ліку хворых паравозаў.

Ступеньчатае дэпо таксама дабілася паляпшэньня сваёй работы. Тут зьменшыліся выпадкі пяўторнага рамонту. У верасьні былі толькі два выпадкі, а ў першай палове кастрычніка—адзін выпадак.

У падарунак XV Кастрычніку жанчыны-абціршчыцы выпусьцілі з абціркі 5 паравозаў. Аўтаматная брыгада і брыгада па капсэрвацыі выпусьціла па 2 паравозы з гарачай прамыўкі. Па старым і ступеньчатым дэпо абвешчан **збор рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд 15 гадавіны Кастрычніка.**

Рабочыя дэпо сартовачнага абавязаліся дабіцца да XV-й гадавіны Кастрычніка ліквідацыі адставаньня вагоннай гаспадаркі, штомесячнага выпуску з конвэйцыйнага рамонту па 150 вагонаў. Нарастаньне тэмпаў ёсьць. У верасьні выпушчана з канвэйцыі 127 вагонаў, а ў першай палове кастрычніка — 66.

Уцільцы дэпо-сартовачнае, уключыўшыся ў падрыхтоўку да XV Кастрычніка, высунуў сустрэчны плян па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў для аздараўленьня вагоннай гаспадаркі. Уцільшчыкі абяцаюць даць 500 буфэрных сьцержняў, 650 ніжніх букс, 300 — верхніх, 5.000—розных балтоў і шмат іншых запасных частак.

Рэалізацыя ўзятых на сябе абавязацельстваў паляпшае работу чыгункі на ўсіх вучастках. Так, работнікі руху (МК № 6) дабіліся зьніжэньня прастою транзітных вагонаў з 9 ,5 да 9,2 проц. У жніўні было 17 парушэньняў працдысцыпліны, у верасьні — 3 і адно ў кастрычніку. Зьніжаны прастої пад грузавыя апэрацыі з 19,5 да 19,1.

Да кастрычніцкіх сьвят, чыгуначнікі гомельскага раёну прыходзяць з новымі перамогамі на фронце паляпшэньня сваіх матар'яльна-бытавых умоў. **100 новых кватэр і 13 новых сталовак будуць скончаны да сьвята.** Намячаецца таксама адкрыцьцё раду культурна-асьветных устаноў.

Падрыхтоўка да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ўвязваецца з падрыхтоўкай да 3-га ўсесаюзнага конкурсу спараных брыгад. Звыш 30 паравозаў ужо ўключаны ў конкурс. Заявы аб уключэньні ў конкурс працягваюць паступаць.

Чыгуначнікі Гомелю сустракаюць 15 гадавіну Кастрычніка моцнай хваляй творчага энтузіязму, выкананьнем сваіх бальшавіцкіх абяцаньняў.

У адзнаку сваёй адданасьці партыі, лепшыя ўдарнікі—старыя рабочыя паступаюць у яе рады. Толькі на Гомельскаму вузлу паступіла звыш 50 заяў аб прыёме ў партыю.

Н. Гасман.

Вагоны „Маці і дзіцяці“

На вагонна-рамонтным заводзе «Полымя рэвалюцыі» (Менск) прыступлена да пераабсталяваньня да XV-годзьдзя Кастрычніка вагону для маці і дзіцяці.

Задачы вагону—даць культурныя ўмовы маці і дзіцяці ў дарозе. У вагоне абсталёўваецца дзіцячы душ з падводам цёплай вады, дзіцячая гулялка-салён, плітка для падаграваньня ежы і дзіцячая ўборная. Вагон круглы суткі будзе забясьпечан кіпятком.

Ідэя вагону знайшла гарачае спачуваньне сярод рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу заводу.

Да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі паштова-пасажырскі цягнік Менск - Масква будзе забясьпечан вагонам «маці і дзіцяці».

НКШЗ павінен пакланаціцца, каб забясьпечыць у бліжэйшы час такімі вагонамі ўсе цягнікі далёкага следаваньня.

Фэйгіна.

Новыя пабудовы

БАРЫСАЎ. 28 (БЕЛТА). Да кастрычніцкіх сьвят уступае ў строй поваг пабудаваны хлебазавод. Штодзённая выпечка хлеба—50 тон. Капчаецца будаўніцтва 18 кватэрнага дому ў Нова-Барысаве і пабудова лазьні.

Да дня XV гадавіны рабочыя Барысаўшчыны атрымаюць яшчэ адну перамогу на фронце культурнага будаўніцтва. У дні сьвята ўжо будзе працаваць гукавое кіно, якое абсталёўваецца ў гарадзкім тэатры.

Віцебшчына да Кастрычніка

* Да Кастрычніцкіх сьвят гарэна прысьвяцілі адкрыцьцё новапабудаванай Гаўскай школы (Елатынскі сельсавет), скончаньне двух будынкаў для Міхалеўскай ШКМ і новых будынкаў для Рудзкоўскай ШКМ. У горадзе будзе адкрыта школа - дзесяцігодка ў Пралетарскай слабодзе.

* Будаўніцтва сталоўкі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі, скончаньне якой намечана на 15 гадавіны Кастрычніка, падыходзіць да канца. Да сьвята будзе цалкам скончана. На цагельні заканчваецца будаўніцтва сушылкі.

* Каагульны аддзел гарсавету да Кастрычніка праводзіць на акраіне гораду электрычную сетку.

* Гарснаб адкрывае першага лістапада каапсны базар у Пралетарскай Слабодзе. На Смаленскім рынку адкрываецца новая чайная.

* Масавы аддзел гарсавету арганізаваў распрацоўку адзовы дэпутатаў і секцыянэраў маскоўскіх заводаў на ўсіх пленумах, дэпутацкіх групах, секцыях сельсаветаў. 15 таварышоў з ліку савецкага актыву накіраваны ў сельсаветы для дапамогі ў падрыхтоўцы да сьвята, стварэньня дэпутацкіх груп у калгасах, саўгасах і пры сельсаветах — секцый.

Зарубежны.

Хроніка падрыхтоўкі

* **Белдзяржкіно** да XV гадавіны Кастрычніка выпускае дзве поўнаметражныя мастацкія гукавыя карціны «Слава сьвету», і «Зварот Нэйтана Бэкера», таксама выпускаецца дакументальная, кароткаметражная карціна ў двух частках, якая асьвятлоўвае сацбудаўніцтва БССР у чацьвертым заключным годзе пяцігодкі.

Выйдуць два нумары — 19 і 20 — кіночасопісі, дзе будзе паказана падрыхтоўка да сьвята, на фоне посьпехаў сацбудаўніцтва і ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Ад Белдзяржкіно выехала ў Маскву кінобрыгада, якая зробіць здымкі для спэцыяльнай кіно-часопісі.

У дні сьвяткаваньня XV гадавіны Кастрычніка будуць зроблены кіно-здымкі ўрачыстасьцяй, пуску новых заводаў і фабрык і г. д.

Ва ўсіх кіно-тэатрах Белдзяржкіно 7 і 8 лістапада — дармовыя дзённыя сэансы для дзяцей і Чырвонай арміі.

* **Пуск аўтаматычнай тэлефоннай станцыі (АТС)** прызначан на 5 лістапада. Абаненты пераключаюцца на новую падземна-кабельную сетку. Агульная ёмкасьць станцыі — 6 тысяч нумароў, з іх спачатку будзе ўключана 2,5 тыс. і пра 2-3 месяцы апошніх.

Работы вядуць — галоўны інжынэр трэсту «Связьмонтаж» — тав. **Падмагільны** і інж. **Гілярэвіч.** На будаўніцтва станцыі Беларускім кіраўніцтвам сувязі выдаткавана звыш 3 з шалов. мільёнаў руб.

* **Менскі рэспубліканскі тэлеграф** да Кастрычніцкіх сьвят будзе тэхнічна пераабсталяваны. Устанаўляецца хутка-дзейная апаратура і камутатары. Гэта значна палепшыць якасьць работы тэлеграфу, квітанцыя ліквідуе сказаньні тэлеграм.

* **На дрэваапрацоўчым заводзе** імя Молатава па цэхах шырока разгорнута масавая работа па папулярызацыі вынаходніцтва.

Вынаходнікі заводу абавязаліся да XV гадавіны Кастрычніка перавыканаць кантрольную пічбу (270 членаў), уцягненьня ў рады вынаходнікаў. **Да XV-й гадавіны Кастрычніка завод будзе мець сваю моцную эксперымэнтальную базу.**

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Цікавыя вопыты культываваньня сої ў Беларусі

Соя добра высьпявае ў БССР. Вопыты біялёгічнага інстытуту Беларускай Акадэміі навук гэта пацьвердзілі.

Сёлета інстытутам былі праведзены вопытныя пасевы сої ў 25 пунктах паўднёвай і паўночнай часткі Савецкай Беларусі.

Досьледы паказалі, што культура сої ва ўмовах БССР можа даваць з аднаго га да 30 тон зялёнай масы і 20 цэнтн. высока-гатункового насеньня.

Для папулярызацыі вынікаў сваіх вопытаў, інстытут рыхтуе да выданьня матар'ялы дасьледчай работы над сояй.

КАРМОВЫ ГАТУНАК СОІ «ЧОРНАЯ АМУРСКАЯ» ДОБРА ВЫСЬПЯВАЕ Ў БССР.

Дэлегацыя БССР на сусьветным кангрэсе МОПР'у

10 лістапада ў Маскве адкрываецца сусьветны кангрэс МОПР'у.

АД БССР на кангрэс дэлегуюцца лепшыя ўдарнікі-апрацоўцы: рабочы тав. **Варонічаў** (Менск) і хатняя гаспадыня т. **Бярдзіхіна** (Гомель).

Хроніка

* Старшыня ЦКК КП(б)Б і нарком РСІ тав. **Лычоў** прыехаў у **Гомель**, дзе наведаў Гомсельмаш, паравозарамонтны завод імя Ланцуцкага, дрэваапрацоўчы завод і Шклобуд. На Гомсельмашы тав. **Лычоў** прыняў удзел у вытворчай нарадзе ліцэйшчыкаў, дзе абгаварвалася пытаньне аб барацьбе з бракам ліцьця.

* **150** лепшых рабочых-ударнікаў і прафсаюзных актывістаў вылучаюцца на адказную работу ў ЦК саюзаў, ЦСПСБ і райпрафсаветы. Сярод вылучаных павінна быць ня менш 20 проц. беспартыйных таварышоў і ня менш 25 проц. жанчын.

* **Нормы выдачы бульбы** рабочым жывёла гадоўчых саўгасаў устаноўлены ў 125 кгр. для рабочага і 45 кгр. для ўтрымальца. Для астноўных груп рабочых норма павялічваецца да 140 кгр. Выдача бульбы праводзіцца толькі за лік таварных лішкаў саўгасаў пасьля выкананьня імі цэнтралізаваных загатовак і стварэньня насеннага фонду.

* **Выстаўку на тэму «Нашы дасягненьні»** арганізуе беларускі дзяржаўны сацыяльна-гістарычны музэй. Выстаўка мае мэтай шырока адлюстраваць дасягненьні БССР і СССР да 15- гадавіны Кастрычніка.

* **889 тыс. руб.** намечана адпусьціць у 1933 г. на пабудову 10 новых рабочых клюбаў, з якіх два на торфазводах, два—у зямляробчых саўгасах, пяць—у жывёлагадоўчых саўгасах і адзін—у Гомелі для рабочых сельгасмашпабудаўніцтва. Адначасова будзе скончана пабудова рабочых клюбаў у Рэчыцы, Менску, Віцебску і Чашніках.

* **Скончана пабудова** новага будынку запалкавага тэхнікуму ў Барысаве і будаўнічага фабзавучу ў Гомелі.

навуковыя ўстановы: Інбелкульт і навукова-дасьледчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі.

Апрача таго, навукова-дасьледчая праца ў гэты час вялася беларускім дзяржаўным універсытэтам, беларускай дзяржаўнай акадэміяй сельскай гаспадаркі ў Горках, Віцебскім ветэрынарным інстытутам, а таксама бактэрыялёгічным інстытутам імя Пастэра. У гэты час БССР мела ўжо каля 403 навуковых працаўнікоў з якіх 59 прафэсароў.

***

З уступленьнем Савецкага саюзу ў рэканструкцыйны перыяд, у Савецкай Беларусі, як і ва ўсім СССР, пачаўся вялізарны рост навуковай працы. Колькасьць дасьледчых устаноў, колькасьць навуковых работнікаў, размах і арганізацыя ўсёй навуковай працы пачалі расьці вялізарнымі тэмпамі. Іменна ў гэты час пачалося і арганізацыйнае аб'яднаньне навуковых марксыцкіх сіл Беларусі. Першая спроба ў гэтым напрамку была зроблена яшчэ ў 1923 годзе, калі было заснавана «Беларускае Марксыцкае Таварыства». Але ў сувязі з тым, што ў БССР тады мелася яшчэ зусім мізэрная колькасьць навуковых работнікаў - марксыстаў, гэта спроба не дала адпаведных вынікаў. Толькі ў маі 1927 г. арганізавалася беларускае аддзяленьне таварыства гісторыкаў - марксыстаў, якое ў чэрвені 1928 г. зьлілося з новаарганізаваным «Таварыствам марксыстаў БССР». Таварыства працавала ў складзе 4-х секцый: філёзофскай, гістарычнай, эканамічнай і літаратурнай. З 1930 г. «Таварыства марксыстаў БССР» уступіла месца пасобным марксыцкім таварыствам ТВМДБ, гісторыкаў марксыстаў, марксыстаў - эканамістаў і г. д. У сярэдзіне 1929 г. пры Белакадэміі навук пачала функцыянаваць катэдра марксызму - ленінізму, якая потым разгарнулася ў інстытут філёзофіі БАН.

Рэарганізацыя Інбелкульту ў Беларускую Акадэмію Навук, якая адбылася 1 студзеня 1929 г., адначала вялікі крок наперад у справе арганізацыі навукова - дасьледчай справы, у справе разьвіцьця беларускай пралетарскай культуры. У той час пачаў узьнікаць цэлы рад новых дасьледчых інстытуцый, мэтай якіх было ажыцьцяўляць навукова-дасьледчую працу ў пэўных галінах гаспадаркі і культуры.

Да XV-годзьдзя Кастрычніка пралетарыят БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, стварыў вялікую сетку навукова-дасьледчых устаноў, якія працуюць у нашай рэспубліцы. Беларуская Акадэмія Навук мае ў сваім складзе 12 інстытутаў: гісторыі, мовы, літаратуры і мастацтва, філёзофіі, эканомікі, савецкага будаўніцтва і права, геалёгіі, хэміі, агра-глебавы, фізыка-тэхнічны, псыханэўролёгічны, біялёгічны, а таксама 4 нацыянальныя сэктары: яўрэйскі, польскі, літоўскі і латыскі. Камісія па вывучэньні Заходняй Беларусі і сэктар масавай працы і краязнаўства.

Апрача Акадэміі Навук, значную навукова-дасьледчую дзейнасьць ажыцьцяўляе рад інстытутаў: НДІ прамысловасьці, НДІ калгаснага будаўніцтва, ПДІ саўгаснага будаўніцтва, інстытут гісторыі партыі, балотны інстытут, Горацкая станцыя малочнай жывёлы, інстытут аздараўленьня арганізацыі працы, гігарэнтінстытут, НДІ камбыхаваньня, лесаправесны інстытут, ветэрынарна-дасьледчы, селекцыйная станцыя, станцыя буйнай рагатай жывёлы, сьвінагадоўчы інстытут, цэнтральная бульбяная станцыя і інш. Треба таксама адначыць навуковую працу, якую праводзяць Дзяржаўны музэй, Дзяржаўны архіў БССР і Белдзяржбібліятэка.

Апошняя пастановай ОНК БССР ад 10-га жніўня рэарганізавана ў Дзяржаўную бібліятэку і бібліяграфічны інстытут БССР імя Леніна. Бібліятэка за 10 год свайго існаваньня вырасла ў буйную навуковую ўстанову з мільённым кніжным фондам, з сярэднім штогоднім узростам у 100.000 томаў. Бібліятэка мае звыш 6.000 чытачоў, са штодзённым наведваньнем у 500—550 асоб.

Мы маем на сёньня значную армію навуковых працаўнікоў — звыш 1.600 чалавек, аб росьце якой даюць уяўленьне наступныя лічбы: у 1921 г. БССР мела 78 навуковых працаўнікоў, у 1924 — 317, у 1928 г. — 509, у 1930 г. — 1.156. Сярод нашых навуковых працаўнікоў — 22 акадэмікі, 115 прафэсароў і 126 вучоных спэцыялістаў. Партыйная праслойка сярод навуковых працаўнікоў складае 29 проц. Па сацыяльным паходжаньні: з рабочых — 15 проц., з сялян — 39 проц., са служачых — 40 проц., з іншых — 6 проц. Па нацыянальнасьці: беларусаў — 49 проц., яўрэяў — 25 проц., расійцаў — 19 проц., палякаў — 3 проц., іншых (літоўцаў, латышоў, немцаў, украінцаў) — 4 проц.

Значныя дасягненьні ёсьць у справе падрыхтоўкі новых навуковых кадраў з рабочых і сялян, з працоўнага насельніцтва карэнных нацыянальнасьцяй БССР. На 1 ліпеня 1932 г. было па навукова-дасьледчых установах БССР 412 асьпірантаў. Сярод іх налічвалася 30,8 проц. рабочых. У агульным ліку асьпірантуры партыйцы складаюць 64,8 проц., кажамольцы — 16,5 процантаў. Па нацыянальнасьці: беларусаў — 58 проц., яўрэяў — 3 проц., расійцаў — 4 проц., палякаў — 1,5 проц., іншых нацыянальнасьцяй — 6,5 проц.

Па ўсіх навукова-дасьледчых установах БССР пляны 1932 г. маюць 1.056 навуковых тэм.

Навуковая дасьледчая мысьль БССР працуе цяпер пад радам пытаньняў, якія маюць вялікае значэньне для нашага сацыялістычнага будаўніцтва. У 1932 годзе праведзена вялікая комплексная экспэдыцыя па вывучэньні культуры, быту і прыроды Палесься.

Беларуская Акадэмія Навук выдала навуковую прадукцыю ў мінулым годзе ў колькасьці 500 друкаваных аркушаў, а сёлета намечана 1.205.

Значныя дасягненьні ёсьць, апрача БАН, і па іншых навукова-дасьледчых установах. Напрыклад, інстытут прамысловасьці вёў пасьпяховую работу па вывучэньні вырабу паперы з ільняной кастры, па ўжываньні ў БССР глінт-цэмэнту, па новай — аэрабавай мочы ільну і г. д.

Балотны інстытут займаецца праблемай асушэньня балотных зямель, рэгуляваньнем палескіх рэк, спэцыялізацыяй сельскай гаспадаркі на асушаных балотах і г. д. Горацкая станцыя малочнай жывёлы распрацавала нормы і формы мінэральных угнаеньняў пад кармовыя палявыя культуры, праблему прадукцыйнасьці сіласных культур. Інстытут камбыхаваньня вывучае палітэхнічную школу, праблемы выкладаньня на асобных дысцыплінах, піянэр-рух і г. д.

Вялікія посьпехі, якія рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі дабілася ў разгортваньні навукова-дасьледчай работы ў БССР, дасягнуты ва ўмовах напружанай, працяжнай у вельмі складаных формах клясавай барацьбы.

Клясавы вораг ня раз імкнуўся скарыстаць навуку для таго, каб пад яе прыкрыцьцём прапагандаваць варожыя пралетарыяту, накіраваныя супроць сацыялістычнага будаўніцтва, ідэі. Партыя выкрыла і ліквідавала ўсякія спробы скарыстаць навуку для распаўсюджаньня буржуазнай ідэалёгіі.

Значная работа ў сэнсе барацьбы з варожымі ідэалёгічнымі плянамі была праведзена сэкцыяй навуковых працаўнікоў, якая на сваіх пленумах і сходах ня раз абгаворвала пытаньне клясавай барацьбы на навуковым фронце БССР.

На нашым навуковым фронце праводзілася пад кіраўніцтвам партыі актыўная барацьба супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, а таксама супроць контрэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, які імкнуўся замацаваць у нашых навуковых установах, падпраддаваць сваім мэтам навуковую работу. Рашучы адпор сустракалі і іншыя спробы скажэньня прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі на навуковым фронце.

У канцы 1931 г., спачатку 1932 г., на падставе ліста тав. **Сталіна** ў часопіс «Пролетарская революция», была разгорнута ў шырокім маштабе бальшавіцкая самакрытыка сярод навуковых работнікаў, ахапіўшы сабой асабліва марксыцкія таварыствы. У выніку абгаварэньня ліста тав. **Сталіна**, былі выкрыты розныя апартуністычныя праўленьні і плыні ў навуковай прадукцыі БССР.

Падкрэсьліваючы ўсю грандыёзнасьць нашых дасягненьняў у галіне навукова-дасьледчай работы, мы не павінны забываць, што ў ёй ёсьць яшчэ сур'ёзныя недахопы. Яна яшчэ не даволі цесна зьвязана з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва БССР, вынікі гэтай працы не рэалізуюцца належным чынам у народнай гаспадарцы, навуковая работа не даводзіцца як сьлед да шырокіх працоўных мас. Значны недахоп і ў тым, што нашы вышэйшыя навучальныя установы ў пераважнай большасьці зусім не вядуць навукова-дасьледчай работы.

У маі 1932 году адбылася ўсебеларуская канфэрэнцыя па навукова-дасьледчай працы ў другой пяцігодцы. Канфэрэнцыя намеціла асноўныя рысы навукова-дасьледчай працы па БССР у другой пяцігодцы. Завостраная пытаньне аб неабходнасьці ліквідаваць адставаньне навукі ад практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

***

Нам здаецца, што паданых вышэй фактаў даволі, каб пераканацца ў тым, якія вялізарныя магчымасьці створаны ў Савецкай Беларусі пры дыктатуры пралетарыяту для разьвіцьця навуковай мысьлі, навукова-дасьледчай працы.

Толькі Кастрычнік, які ператварыў «турму народаў» расійскай імпэрыі ў вялікі Савецкі саюз працоўных 150 нацыянальнасьцяй, будуючы сацыялізм, — стварыў магчымасьці навукова - дасьледчай працы на Беларусі.

Канчаючы пятнаццатую гадавіну дыктатуры пралетарыяту, Савецкая Беларусь, у брацкім саюзе з усімі рэспублікамі сацыялістычнай баўкаўшчыны працоўных усяго сьвету, пераможна ўступае, пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскай партыі, у другую пяцігодку. Гэта — пяцігодка канчатковай ліквідацыі «эканамічнай і культурнай адсталасьці нацыянальнасьцяй, атрыманай у спадчыне ад царскага калёніяльна-капіталістычнага рэжыму» (з пастаноў XVII партканфэрэнцыі). Гэта — эра начуванага росквіту навукі, які робіць магчымым выключна сацыялістычнае грамадзтва. На парозе другой пяцігодкі навуковы фронт БССР павінен яшчэ больш наблізіцца да актуальных задач сацыялістычнага будаўніцтва гаспадаркі і культуры БССР, яшчэ больш упарта змагацца за рэканструкцыю навукі на плянавых падставах, за ленінскую партыйнасьць у навуцы, за генэральную лінію партыі на ўсіх галінах тэорыі.

На выстаўцы Рамана Семашкевіча

Вучань Браніслава Тарашкевіча, парабкаў сын з Віленшчыны, самасмолец, знаемы з асьледаю фашысцкага рэжыму, мастак выдатнага таленту **Раман Семашкевіч** наладзіў сваю выстаўку ў Менску, у памяшканьні Дому Камасьветы.

Раман Семашкевіч мае багата чаго расказаць нам. Ён дужы вялікай сацыяльнай сувязьзю з нізамі прыгнечанага сялянства **Заходняй Беларусі**, ён зьяўляецца выяўніком ягоных пакут, пратэстаў і змаганьня з эксплёататарамі, ён пясе і гаворыць нам усё гэта.

Мастак глядзіць вочыма сучаснага клясавага чалавека і, мабыць, з гэтай прычыны ўсе бакальныя сюжэты, што прыгледзіліся, прыняліся ўжо, прыкладам, старое дрэва з філіянам—аказываюць, устаюць у новым сьвяце, прымушаюць спыніцца. І ўспамінаецца, як бездапамежна і недалужна выглядала на адной з нашых выставак гэткае-ж дрэва, вынятае за прадуленьне імпрэсыянізму ў беларускім выяўленьцтве.

Раман Семашкевіч улівае новы струмень у выяўленчае мастацтва. Ніякіяе багацьце фарбаў, надзвычайная сьмелась лініі, багацьце рэвалюцыйнага тэмпарамэнту высоўваюць яго ў першыя рады майстраў Саюзу, робяць яго новай, арыгінальнай постацью савецкага мастака.

Семашкевіч нясе з сабой новае. Гэтае новае вымагае свайго імя. Трэба даць імя гэтаму сьвежаму мастацкаму выяўленьню нашай рэспублікі, нацыянальных уласьцівасьцяй яе, а таксама і Беларускі Заходняй, якая знаходзіцца пад уціскам Польшчы. Вядома, глыбокая нацыянальнасьць Семашкевіча была-б пустым і шкодным гукам без сацыяльнай насычанасьці яго творчасьці. Гэта насычанасьць ёсьць. Яна дае падставу меркаваць, што мастак дасьць багата, дасьць шмат карысьці сацыялістычнаму будаўніцтву.

Творчасьць Семашкевіча цесна зьвязана з БССР як тэматыкай, так і спосабамі выяўленьня. Гэтага бракавала ўсім папярэднім мастацкім выстаўкам. Ёсьць заходы, што ў работах Семашкевіча пануе дзіцячасьць, так званы інфантылізм. Вядома, гэта ілюзія. Такіх-ж заходы рабіліся і Георгу Гроссу, вялікаму графіку Нямеччыны. Што датычыць Гросса, дык ад яго можна правесьці прэстэтуа да Семашкевіча іменна ў заваграмасьці, палітычнай насычанасьці малюнку, але і гэта падабенства дужа далёкае.

У мастака дужа многа тэм, дужа многа зьместу і мастацкага тэмпарамэнту і ён хапаецца, спяшае перадаць, выказаць усё, што цікавіць і поўніць яго. Такая багатая на тэмы наша сучасьнасьць і Семашкевіч адзін з лепшых выяўнікаў яе.

Часамі ён піша па дзесяць палотнаў за дзень. Гэта цяжка ўявіць. За дзесяткі год работы мастакі зьбіраюць на выстаўку 20-30 палотнаў, ды і таго менш. І справа ня толькі ў колькасьці. У кожнай рабоце Семашкевіча ёсьць іскра вялікага таленту, што выдае карціну, робіць яе адменнаю, ня гледзячы на некаторую недапрацаванасьць, недакончанасьць. Яна патрабуе абмеркаваньня гэта недакончанасьць. Можа гэта прыём, асабліваасьць працы мастака? Патрэбен дыспут, патрэбна слова пралетарскай грамадзянасьці, каб Семашкевіч адчуў свае хібы, усьведаміў свае месца.

Трэба сказаць, што да гэтага мастака, твары якога набыла Трэцьцякоўская галерэя і рускі мастацкі музэй, пра выстаўкі якога ўжо цэлая гаварыла маскоўская прэса, некаторыя ўстановы, прыкладам, Галоўмастацтва, паставіліся дужа нядбайліва, нават дапамогі ў арганізацыі выстаўкі Семашкевіч ніякай ня меў. Пры ўсіх яго хібах, мы выразна бачым сацыяльны пашпарт Семашкевіча, мы бачым савецкага мастака значнага таленту. Семашкевіч, пры чуйных адносінах, пры стварэньні адпаведных умоў для працы, пры таварыскай дапамозе і крытыцы здолее абмеркаваць свой талент, абмежаваць у сэнсе накіраваньня яго на буйныя навагкі нашай савецкай рэчаіснасьці без разьмену, расьніданьня на дробязі. Як гэта ня дзіўна і ня сумна, нават нашы мастакі холадна прамаўчалі адкрыцьцё выстаўкі Семашкевіча. Маўчаньне ніцікавае, асабліва прыгадаўшы, як дружна выступалі яны на абарону сярэдняй рукі праекту помніка Ленину работы Груба. Нельга-ж уважаць за сур'ёзнае абмеркаваньне сухі дакладзік т. Гаўрылетка і «прывітальнае» выступленьне Кастэлянскага.

Гарэўмастацтва павінна ўзяць пад увагу, што выстаўкі Семашкевіча нельга абмінуць з прычыны не вялікага значэньня, што работы Семашкевіча варты таго, каб іх набыць у музэй, што выстаўка Семашкевіча—гэта не рамога, гэта этап у разьвіцьці беларускага выяўленьцтва.

Пралетарская грамадзянасьць павінна сказаць сваё слова, гэта будзе дапамогаю ня толькі Семашкевічу, гэта забясьпечыць рост і разьвіцьцё ўсіх мастацкіх кадраў для вялікай справы стварэньня мастацтва, вартага на шай эпохі.

Максім Лужанін.

„ПЯШЧЭРНЫЯ ЛЮДЗІ“

ВІЛЬНЯ, 29 (Уласн. інфармацыя). Польская буржуазная прэса абрадавана чартовай сэнсацыяй: у Польшчы адкрыта «новае племя пяшчэрных людзей»... Дакладны адрас «пяшчэрных людзей»—Кракаў, гэты фарпост польскай буржуазнай культуры...

«Дзеньнік віленскі» так апісвае «новае племя»:

«За апошнія часы ў Польшчы ствараласяновае племя пяшчэрных людзей. Жывуць яны ў падземельях закінутых кракаўскіх фартоў, за могілкамі. Сем'і знайшлі сабе прытулак у пяшчэрах, зробленых самым прымітыўным спосабам».

Галодныя беспрацоўныя, выкінутыя на вуліцу, прымушаны выкапваць пяшчэры, каб знайсьці сабе прытулак. Іншага месца для іх у фашысцкай Польшчы не аказалася. Ня ўсе, аднак, могуць карыстацца і гэтымі «кватэрамі», за якія фашысцкая дыктатура вялікадушна не патрабуе ніякай платы. Старыя, хворыя беспрацоўныя «жывуць» проста... па сьметніках.

«Дзеньнік віленскі» адзначае, што «пяшчэрныя людзі» знаходзяцца таксама і на цэнтральным сьметніку Кракава. «На гэтым сьметніку,—піша газэта,—жыве, напрыклад 86-гадовы Ян Влох са сваёй 75 гадовай жонкай. Зморaныя голадам, яны дажываюць свае апошнія дні на сьметніку».

І гэта ў Кракаве—праслаўленым цэнтры польскай культуры! Што-ж гаварыць аб іншых гарадох!

ЗАБАСТОВАЧНЫЯ БАІ ПОЛЬСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

ВАРШАВА, 30 (Уласн. інфармацыя). Забастовачная барацьба польскага пралетарыяту нарастае. Па ўсёй краіне ў адказ на зьніжэньне зарплаты рабочым арганізуюцца забастоўкі. Следам за варшаўскімі камунальнікамі і лодзінскімі тэкстыльшчыкамі забаставали рабочыя фабрыкі Шоэка (Саснавец).

Новадам для забастоўкі паслужыла спроба прадпрыемцаў зьнізіць зарплату на **20** проц. Усе 700 рабочых фабрыкі кінулі работу. Перагаворы інспэкцыі працы з рабочымі не далі ніякіх вынікаў. Забастоўшчыкі ўпарта абараняюць свае патрабаваньні. Усе мясцовыя паліцэйскія сілы мабілізаваны. Прадпрыемцы паслалі сваіх агентаў у Варшаву за інструкцыямі, на падставе якіх можна «законна» ажыцьцявіць 20 проц. зьніжэньне зарплаты і задушыць забастоўку.

Ня-рэйшаму бастуюць рабочыя на фабрыцы лодзінскай фірмы «Горак». Фабрыканты з мэтай зламаць забастоўку імкнуцца прымусіць рабочых сваёй другой фабрыкі выканваць падвойную работу з тым, каб яны замянілі забастоўшчыкаў, працуючы па 16 гадзін у суткі.

Абураныя рабочыя арганізавалі масавую дэманстрацыю перад фабрыкай. Каля фабрычнай брамы сабралася шмат рабочых. Выкліканая паліцыя пусьціла ў ход зброю. Пам'ж паліцэйскімі атрадамі і рабочымі адбылася крывавая сутычка. Фабрыка закрыта. Такім чынам усе прадпрыемствы фірмы «Горак» не працуюць.

Выбухнула забастоўка на папяровай фабрыцы ў Слопіме. Усе рабочыя ня выйшлі на работу. Забастоўшчыкі патрабуюць павышэньня зарплаты. Рабочыя не дапускаюць штрэйкбрэхераў на прадпрыемства.

Наступілі таксама паведамленьні аб новых забастоўках, якія пачаліся на лесапільных заводах у Белавескай пушчы.

БУРНЫЯ ХВАЛЯВАНЬНІ СТУДЭНЦТВА

БАРШАВА, 29. Бурныя дэманстрацыі студэнтаў 27 кастрычніка адбыліся таксама ў Вільні, Львове і Познані. Газэты паведамляюць, што на мітынгу перад будынкам варшаўскага унівэрсытэту выступаў ка муністычны прамоўца, прычым пашыраліся ў вялікай колькасьці рэвалюцыйныя лістоў кі. Як паведамляюць газэты, усюды адпагалосна былі прыняты рэзалюцыі аб абвяшчэньні ўсеагульнай забастоўкі студэнтаў. Забаставалі студэнты унівэрсытэту ў Познані. Студэнцкія пікеты не прапускаюць нікога ва унівэрсытэт.

ЗЯМЕЛЬНАЯ КАБАЛА

ВАРШАВА, 29 (Уласн. інф.). У фашысцкай Польшчы ўзмоцнена праводзіцца славутая «зямельная рэформа». Яна носіць яўна антэрэвэнцыяністкі характар. Асноўнымі мэтамі рэформы зьяўляюцца: па-першае — узбуйненьне памешчыцкіх маёнткаў; па-другое — стварэньне ў краіне шырокага кулацкага пласта, на які фашысцкая дыктатура магла-б апірацца ў выпадку вайны, і па-трэцяе — насяджэньне вайсковага і цывільнага асабіцтва на тэрыторыі акупаванай Зах. Беларусі і Зах. Украіны, асабліва ў прымежнай зоне (ваенная калёнізацыя).

Прымусовае насяджэньне кулацкіх хутароў (**камасацыя**) яшчэ больш абвастрае і без таго цяжкае становішча асноўных мас сялянства. Сяляне ў большасьці прымушаны кідаць зямлю і ісьці або ў батракі да памешчыка і кулака, або ў горад і павялічваць там галодную армію беспрацоўных. Тыя-ж сяляне, якія выйшлі на хутары, фактычна апынуліся ў поўнай кабале ў памешчыка і кулака.

Цяпер нават нацыянал-фашысты з «Беларускай крыніцы» вымушаны праліваць кракадзілавы сьлёзы над нявыносным становішчам вышаўшых па хутары. У сваім апошнім нумары нацыянал-фашысцкая «Беларуская крыніца» піша:

«Сяляне вёскі Чорная, Пастаўскага сельсавету, будучы малазямельнымі, пайшлі на камасацыю з дарэзкай зямлі ад маёнтку памешчыка Шэздоцкага. Так і зрабілі. Малазямельным дадалі па 2-3 гэктары зямлі з умовай плаціць па 100 злотых за гэктар штогодна на працягу 41 году.

Толькі цяпер сяляне, калі напрабавалі плаціць, апомніліся і ўбачылі, што гэктар зямлі ім будзе каштаваць больш чым 4.000 злотых. Такім чынам сяляне апынуліся ў вельмі цяжкім становішчы.

Беларускія нацыянал-фашысты — гарэзныя апалягеты фашысцкай камасацыі, утойваюць па зразумелых прычынах факты актыўных выступленьняў сялянства супроць зямельнай рэформы. Між тым у радзе месц бязупынна адбываюцца крывавыя сутычкі паміж сялянствам і паліцыяй на глебе прымусовага насяджэньня хутароў.

У вёсцы Завадзічы, Гарадзенскага павету, напрыклад, каля 200 сялян, узброеных косамі, прагналі прэч чыноўнікаў, якія прыехалі праводзіць камасацыю. У вёску неадкладна прыбыў атрад паліцыі пад кіраўніцтвам камісара. Сяляне сустрэлі паліцыю градам каменьняў цапамі і косамі. Паліцэйскія пусьцілі ў ход зброю. Барацьба цягнулася некалькі гадзін. Есьць шмат параненых. Па ўсёй вёсцы праведзены шматлікія арышты. Група сялян ужо накіравана ў павятовую турму.

На месца крывавых падзей прыбыла спэцыяльная карная экспэдыцыя.

РАСПРАВА НАД УДЗЕЛЬНІКАМІ „ГАЛОДНАГА ПАХОДУ“

ЛЕНДАН, 29 (ТАСС). Арыштаваныя ў часе дэманстрацыі ў Гайд-парку 14 беспрацоўных прадсталі перад судом: 2 прыгавораны да 6 месяцаў зьняволеньня, 2 аштрафаваны. Адзін сур'ёзна паранены беспрацоўны пакінут пад вартай. 8 чалавек пакінуты ў папярэднім зьняволеньні. Адзін вызвален.

***

ЛЕНДАН, 29 (ТАСС). Камуністычны кандыдат на муніцыпальных выбарах Мак Гры арыштаваны ў часе прамовы на сходзе 500 рабочых і беспрацоўных, пратэставаўшых супроць прыгавору біркенхэдзкім дэманстрантам. У просьбе аб вызваленьні Мак Гры пад заклад адмоўлена.

Бэльгійскія гарнякі бастуюць

ПАРЫЖ, 29 (ТАСС). «Юманітэ» паведамляе, што бэльгійскія гарнякі аднаўляюць барацьбу супроць зьніжэньня зарплаты. Трэцяга дня спынілі работу гарнякі капальняў Арнэт у раёне Шарлеруа. Учора забаставалі звыш 400 гарнякоў прадпрыемстваў Леван у Гем.

Пагалоўная ваяннізацыя японскай моладзі.

ФАШЫСЦКІЯ НАПАДЫ

ВЕНА, 29 (ТАСС). У венскім унівэрсытэце на працягу двух тыдняў ня спыняюцца выступленьні нацыянал-сацыялісцкіх студэнтаў супроць антыфашысцкіх. Паліцыя адмаўляецца выступаць супроць фашыстаў. 26 кастрычніка фашысцкія штурмавыя атрады захвацілі будынак унівэрсытэту, зьбілі 7 чужаземных студэнтаў, у тым ліку чатырох амэрыканцаў. У сувязі з гэтым генконсул ПАЗШ прад'явіў пратэст аўстрыйскаму ўраду, даручыўшаму рэктару, які салідарызуецца з нацыянал-сацыялістамі пры несьці прабачэньні консулу ПАЗШ. Унівэрсытэт «да аднаўленьня парадку» закрыт.

ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў Н'Ю-ЁРКУ

Н'Ю-ЁРК, 29 (ТАСС). Звальненьне Джэксона, выкладчыка Н'Ю-Ёрк Сіці Коледж у сувязі з удзелам яго ў перадвыбарчай кампаніі кампартыі, выклікала бурныя пратэсты з боку студэнтаў. Выкліканая адміністрацыяй паліцыя атакавала дэманстрантаў, зьбіла 20 чалавек, арыштавала чацьвярых, уключаючы выкладчыка эканамічных навук Калумбійскага унівэрсытэту. Калі арыштаваных адвезьлі ў суд, сабраліся звыш тысячы студэнтаў, зноў наладзіўшых дэманстрацыю пратэсту. Паліцыя зноў атакавала іх і арыштавала 16 чалавек.

Расстрэлы ў Юга-Славіі

ЛЕНДАН, 29 (ТАСС). Белградзкі карэспандэнт «Морынг пост» гаворыць, што голад у Юга-Славіі параджае напады арганізаваных сялянскіх атрадаў на памешчыцкія сядзібы. Карэспандэнт прыводзіць расказы афіцэраў карных атрадаў аб тым, што яны расстрэльваюць сялян. Становішча ў Босніі, Краатыі, Далматыі, Чарнагорыі становіцца, паводле слоў карэспандэнта, усё больш напружаным і можа прывесьці да палітычных выступленьняў».

ПЛЯН

правядзеньня сьвяткаваньня 15-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі па гораду Менску

I. Па гораду

25 X-5 XI. Сходы на прадпрыемствах і ўстановах з дакладамі аб выніках рэалізацыі сама абавязацельстваў, прынятых у адказ на адозву ленінградзкіх рабочых, і выніках вытворчай перакліч. На сходах арганізуюцца выступленьні ўдзельнікаў Кастрычніцкага перавароту і ўдзельнікаў барацьбы за Савецкую ўладу ў БССР.

Адказныя—сакратары парткалектываў і ячэек.

25 X-5 XI. Упрыгожаньне гораду і будынкаў да сьвят.

Адказныя: кіраўнікі ўстаноў, гаржылсаюз і гарсавет т. **Каранеўскі.**

27 X-5 XI. Адкрытыя партсходы з дакладамі на тэму: «15 год Кастрычніка».

Адказныя: сакратары парткалектываў і ячэек і **тав. Левіна** (вызначэньне дакладчыкаў).

30 X-2 XI. Кастрычніцкі калгасны кірмаш (Пляц Парыскай Камуны).

Адказны кірмашом тав. **Гантман.**

2 XI. Кастрычніцкі зьлёт ударнікаў і работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю з дакладам на тэмы. «15 год Кастрычніка і задачы каапэрацыі і дзяржгандлю».

Адказныя—ГК саюзу Дзяржгандлю—т. **Розін і ГСПС—тав. Байкачоў.**

6 XI. Зьлёт чырвонагвардзейцаў і партызан.

Адказныя: т. т. **Ягоўдзін і Яраш.**

3 XI. Кастрычніцкая канфэрэнцыя рабочай моладзі з дакладам: «15 год Кастрычніка».

Адказны т. **Шчагін—ГК ЛКСМБ.**

4 XI. Зьлёт ударнікаў фінансавага фронту аб ходзе выкананьня фінпляну за 4 квартал і прэміраваньне лепшых ударнікаў.

Адказныя—гаркамсод—тав. **Каранеўскі,** гарфа—тав. **Эльперын.**

5 XI. Канфэрэнцыя ўдарнікаў абарончай работы, з дакладамі «15 год Кастрычніка і далейшыя задачы абарончай работы».

Адказны т. **Арнт**—гарсавет Асавіяхіму.

5 XI-8 XI. Адкрыцьцё новых пабудоў і ўстаноў (АТС, дзіцячага кіно, сталовак прадпрыемстваў, рабочых кватэр, палітэхнікуму сувязі і т. д.

6 XI-9 XI. Дзіцячыя раніцнікі ў клюбах прадпрыемстваў і ўстановах.

Адказныя—кастрычніцкія камісіі на мясцох.

5 XI. Агульна-гарадзкі камсамольскі суботнік па ўпрыгожаньні гораду.

Адказныя: т. **Малей** ГК ЛКСМБ, т. **Купак**—гарсавет.

5 XI-9 XI. Кастрычніцкія вечары ў клюбах, прадпрыемствах, жактах (па пляну кастрычніцкай камісіі).

Адказныя—кастрычніцкія камісіі на мясцох.

5 XI. Адкрыцьцё гарадзкой выстаўкі прадметаў шырокага спажываньня.

Адказны т. **Додзін**—ГСПС.

6 XI. Урачысты пленум Менгарсавету сумесна з прастаўнікамі парт., праф. і грам. арганізацый.

Адказны т. **Ягоўдзін**—гарсавет.

6 XI. Вячэрняя факельная дэманстрацыя з удзелам камсамолу, фізкультурнікаў і студэнцтва.

Адказныя: т. **Малей**—ГК ЛКСМБ. Камэндант—т. **Лук'янчык.**

8 XI-7 XI Кіно-сэансы для рабочых гораду з кароткімі прамовамі перад сэансамі на тэму: «15 год Кастрычніка».

Адказны т. **Марголін**—Мендзяржкіно, т. **Левіна** (вызначэньне дакладчыкаў).

6 XI-8 XI. Адкрытыя вулічныя кіно-сэансы ў пунктах гораду (Пляц Волі і акраіны гораду).

Адказны т. **Марголін**—Мендзяржкіно.

7 XI. Парад Чырвонай армії.

Адказны—Начальнік гарнізону.

7 XI. Вялікая кастрычніцкая дэманстрацыя.

Адказныя за калёны мясцовыя кастрычніцкія камісіі, камэндант—т. **Лук'янчык** і ахова парадку—тав. **Дэрман.**

7 XI. Дзённыя кіно-сэансы для піянэраў і школьнікаў.

Адказныя: т. **Марголін**—Мендзяржкіно, т. **Воліс**—ГК ЛКСМБ.

7 XI. Пастаноўкі ва ўсіх тэатрах для рабочых гораду з кароткімі ўступнымі прамовамі аб 15-ай гадавіне Кастрычніка.

Адказныя: ЦП працмастацтва—т. **Турэцкі,** вызначэньне дакладчыкаў т. **Левіна.**

6 XI 8-XI. Дзённыя кіно-сэансы для часьцей Чырвонай армії з уступнымі прамовамі аб 15-й гадавіне Кастрычніка.

Адказныя: т. **Марголін**—Мендзяржкіно. Дом Чырвонай армії.

8 XI. Агульнагарадзкі кастрычніцкі дзіцячы раніцнік.

Адказны т. **Воліс**—ГК ЛКСМБ.

II. Па вёсцы

25 X-30 X. Сходы ў саўгасах, МТС, калгасах і вёсках з дакладамі аб 15-ай гадавіне Кастрычніка, аб выніках і задачах работы па выкананьні пляну бягучых сельска-гаспадарчых кампаній (сяўба, зяблева, сіласаваньне і г. д.), выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай—загатоўкі, мабілізацыя фіндсродкаў і інш. —і аб удзеле ў кастрычніцкім кірмашы ў Менску.

Адказныя сакратары сельячэек.

30 X-2 XI. Выезд чырвоных абозаў на Менскі кастрычніцкі кірмаш.

1 XI-5 XI. Упрыгожаньне саўгасаў, МТС, калгасаў, хат-чытальнь, клюбаў і школ да сьвят.

Адказныя—кастрычніцкія камісіі на мясцох.

30 X-5 XI. Адкрытыя сходы сельячэек з дакладамі: «15 год Кастрычніка».

Адказныя—сакратары сельячэек.

6 XI. Урачыстыя пасяджэньні пленумаў сельсаветаў з парт., праф. і грам. арганізацыямі. Даклад: «15 год Кастрычніка».

Адказныя: т. т. **Ягоўдзін**—гарсавет; старшыні сельсаветаў і т. **Левіна** (вызначэньне дакладчыкаў).

7 XI. Кастрычніцкая дэманстрацыя.

Адказныя—кастрычніцкія камісіі на мясцох.

6 XI-3 XI. Кастрычніцкія вечары ў саўгасах, МТС і калгасах.

Адказныя—кастрычніцкія камісіі на мясцох.

25 X-6 XI. Выпуск двух нумароў насьценгазэт. Першы на падрыхтоўцы да сьвяткаваньня, другі—кастрычніцкі.

Адказныя—рэдкалегіі насьценгазэт.

15 X-8 XI. Выезд і работа 10-ці кіно-перасоўак у вёску і ўстанаўленьне 2-х кіно-стацыянараў.

Адказны т. **Марголін**—Мендзяржкіно.

1 XI-8 XI. Выезд 3-х тэатральна-эстрадных брыгад па вёску для абслугоўваньня МТС, саўгасаў, калгасаў.

Адказны т. **Гурэцкі**—ЦП працмастацтва.

25 X-5 XI. Устанаўленьне 10-ці новых радыёпрыёмнікаў і рамонт усіх наяўных установак. Арганізацыя калектыўнага слуханьня радыё.

Адказныя: Радыё-вузел—т. Галадушка і кастрычніцкія камісіі на мясцох.

Гарадзкая камісія па правядзеньні сьвяткаваньня 15-ай гадавіны Кастрычніка.

Паведамленьне

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 4-XI—22 г. а 6 гадз. увечары ў памяшканьні ЦКК КП(б)Беп. (Савецкая, 53, 3 паверх, пакой 18), адбудзецца пасяджэньне ПК ЦКК КП(б)Б па разгляду апэляцыйных партспраў наступных т.т.:

Апроніча А. Л., Федаровіч І. Ф., Багдановіча Я. С., Грыба Т. А., Корсака Я. А., Стахіна Н. В., Сымончыка Ф. В., Батура Н. В., Галавея І. М., Грэмыка Ц. П., Завьялава С. М., Масквічова М. Я., Медзялянава П. Я., Севасьцьянова М. С., Рудзіцкага Я. А., Русіна М. М., Мазаніка К. Л., Шаблоўскага Я. У., Бэрнштэйна Б. Л., Байдакова Я. К., Матусэвіча Я. К., Валкавіча А. К., Бруселя Л. Н., Суровага Ф. А., Шнэйпера Л. Я., Чуча У. С., Мзікара А. М., Малаковіча П. Е., Думлера У. Я., Найдуна З. Б., Мядзьвецкага У. А., Мядзьведзева П. Н., Волкава С. А., Паўлава Я. В., Зубрыцкага М. В., Берашкава П. А., Зенькова А. А., Санберг Г. Л., Дзрашэвіч Ю. І., Бурэйка У. П., Пятрова А. С., Мельнікава М. А., Вацура Ф. Я., Новаісўскага А. І., Стрычэльскага В. І., Шыкла М. А., Бягуна Г. В., Дулеца Я. Р., Рацэвіча І. Я., Цьсёрко Міхася, Сынітко А. І., Лішая А. З., Бельскага З. К., Бабіча В. І., Ханіна Д. Х., Цельцова Ф. П. (Шмоў), Ракава Я. М., Гатаўскага С. М., Варшаўчыка П. М., Мусіна Х. Д., Нісенбаума Б. А., Егіна З. І., Касача Л. Я., Мілікоўскага Р. Э., Субоцкіна Я. С., Шаблоўскага А. Р.

Яўка памяніёных таварышоў абавязкова з прадстаўленьнем на ПТ характарыстыкі яч. КП(б)Б аб сваёй рабоце.

Пажадана прысутнасьць сакратароў ячэек, на вучоце якіх знаходзяцца памянёныя таварышы.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Беп.

ДАМБРОЎСКІ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

СЁНЬНЯ СЁНЬНЯ

АДКРЫЦЬЦЬЦЁ ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЦУ

(Рог Распубліканскай і Інтэрнаціональнай)

10-га пераробленага дзяржзьвярынцу

У складзе зьвярынцу вялікая калекцыя ўсялякіх дзікіх жывёл, зьвярэй, птушак і прасмыкаючыхся.

Зьвярынец адкрыт з 9 г. раніцы да 11 г. веч.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА (пач.: 6, 7-30, 9, 10-30) 1) гукавы фільм БЯГЛЕЦ 2) гукавы мульт пл фільм ПАРАВОЗ ЦЯГНІ наперад

Інтэрнацыянал — БЕЛЫ АРОЛ Звыш праграмы Кіно-хроніка Саюзкіно

Пралетары — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ЭЛІСО Дзённыя дзіцячыя сэансы КІМ ДЗЯЖУРНЫ

СПАРТАК Пач.: 7, 8-10, 9-20, 10-40. Каса—з 5 г. Выдатны мастацкі фільм ЛІХОЕ ЗОЛАТА Драма ў 6 частках

ГАРКААПХЛЕБАМ АДКРЫТА НА КІРМАШЫ

(пл. Парыскай Камуны)

у спэцыяльным павільёне ЧАЙНАЯ

з прадуктамі на суму 20 тыс. р.

Будзе адпускацца: чай, булкі, розная закуска, халодныя напіткі.

Дырэкцыя.

ГАЛЯНТАРОЙКА-ТРЫКАТАЖНАЕ АБ'ЕДНАНЬНЕ

БЕЛКААПСАЮЗУ ВЫПУСКАЕ НА КІРМАШ

НАСТУПНЫ АСАРТЫМЭНТ ТАВАРАЎ: ГАЛЯНТАРЭЯ ЎСІХ ВІДАЎ, ТРЫКАТАЖ, МЫЛА І ІНШ. ТАВАРЫ

на суму 50.000 рублёў.

Павільён знаходзіцца на пляцы Парыскай Камуны.

Дырэкцыя.

АРЦЕЛЬ „ПЕРАМОГА“ выпускае на КІРМАШЫ

наступны асартымэнт тавараў на суму 20 тыс. рублёў:

цукерак розных, павідла, клюкв. варэньне, воцат, гарчыца і розн. халодныя напіткі.

Павільён і ларок знаходзіцца ка пл. Парыскай Камуны.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

МТПО ДА МІЖРАЁННАГА КІРМАШУ

— ВЫПУСКАЕ НАСТУПНЫ —

асартымэнт тавараў на суму 20 тыс. рублёў:

ПАДУШКІ, ГАРШКІ, ЭМАЛІР, ВЁДРЫ, ТРЫКАТАЖ, ПАНЧОХІ, НАСКІ, РАЙТУЗЫ, ГРЭБНІ, МЫЛА ТУАЛЕТНАЕ, ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ, АНГЛ. ШПІЛЬКІ, КАШАЛЬКІ, НАЧЫНЬНЕ ФАЯНСАВАЕ.

МЭБЛЯ: КРЭСЛЫ ВЕНСКІЯ, СТАЛЫ ВЕШАЛКІ І МЕХАВЫ ТАВАР.

Спэцыяльны павільён ёсьць на пляцы Парыскай Камуны.

Праўленьне.

ВІЦЕБСКАЯ БАЗА САЮЗТРЫКАТАЖСНАБЗБЫТ

даводзіць да ведама належных гандлюючых арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў, што згодна пастановы Наркамлегпраму СССР з 1 кастрычніка г.г. Фонд трыкатажных тавараў дзяржпрамысловасьці, які выдзелены для Беларусі, рэалізуе Беларуская кантора Саюзкіннарбыту ў Менску, куды і трэба зьвяртацца Беларускім установам і арганізацыям за атрыманьнем выдзеленых ім тавараў.

Віцебская база Саюзтрыкатажснабзбыт з памянёнага чысла зьяўляецца выключна выходнай базай, якая рэалізуе тавар прымаемым да ня фабрымам па-за Беларусі.

БАЗА.

Арцель „ПРАМХАРЧ“ ВЫПУСКАЕ НА КІРМАШЫ

наступны асартымэнт тавараў на суму 30 тыс. рублёў:

булкі, пранікі, чай і розныя закускі.

Павільён знаходзіцца на пл. Парыскай Камуны са спэцыяльным абслугоўваючым персаналам

Ёсьць радыё-ўстаноўка.

Праўленьне.

ПРЫ ГОМЕЛЬСКІМ АЎТАДАРОЖНЫМ КАМБІНАЦЕ з 1-XI-32 г. адкрываецца тэхтар завочнага навучаньня

у складзе:

а) завочнага тэхнікуму па падрыхтоўцы тэхнікаў, аўтатэхнікаў, па лароўных машынах, і аўтаэксплёатацыйнай спэцыяльнасьці;

б) курсаў па падрыхтоўцы малодшага тэхнічнага персаналу па тых-жа спэцыяльнасьцях.

На завочнае навучаньне прымаюцца:

а) рабочыя, якія працуюць у аўта-рамонтай вытворчасьці,

б) практыкі, якія займаюць тэхнічныя або адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады ў аўтадарожным транспарце,

в) рабочыя іншых відаў транспарту і прамысловасьці,

г) актыўныя калгаснікі,

д) утрымацы рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу,

е) служачыя, якія маюць на менш 3 год актыўнай грамадзкай работы.

УВАГА: Асобы, паказаныя ў пунктах в, г, д, е, залічваюцца пры ўмове пераходу іх на работу па выбранай спэцыяльнасьці.

У завочны тэхнікум прымаюцца:

а) рабочыя, якія маюць веды ў аб'ёме 7-годнай і двухгадовы рабочы стаж,

б) практыкі, якія выконваюць абавязкі малодшага тэхнічнага персаналу.

Для асоб, якія працуюць у сыстэме Цудтрансу і яго гаспадарчых аб'яднаньняў і камандыраваныя на завочнае навучаньне аддзеламі кадраў мясцовых органаў Галоўдартрансу, Саюзтрансу і аўтаарэнсабу, у лік разьвёрстки—навучаньне дармовае за выключэньнем выдаткаў за навучальныя прылады.

Іншыя асобы аплачваюць навучаньне ў залежнасьці ад заработку ў межах ад 2 проц. да 7 проц.

Для залічэньня неабходна прадставіць:

а) анкету, зацьверджаную партыйнымі, прафэсыянальнымі, або савецкімі органамі,

б) водзыў па месцы работы,

в) дакументы аб адукацыі, калі ёсьць,

г) камандыроўку,

д) даведку аб заработку.

Даведкі на завочным навучаньні выдаюцца сакратарам завочнага навучаньня ў аўтадарожным тэхнікуме (Савецкая, 76) ва ўсе дні апрачы 4, 10, 16, 28.

Дырэктар НУХАРЭНКА.

З 15 кастрычніка пачаліся заняткі са студэнтамі 3-га курсу інстытутаў: буйнай рагатай жывёлы, прадзільных пультур і нарэсога, якія былі, у сакавіку—красавіку месяцах г. г.

МАБІЛІЗАВАНЫ для працы па насяўной і ўборачнай кампаніях.

НАРКАМЗЕМ БССР ПРАПАНУЕ СТУДЭНТАМ

указаных курсаў інстытутаў

ЗАРАЗ-ЖА ЗЬЯВІЦЦА НА ЗАНЯТКІ

ў свае інстытуты, а ўстановам і арганізацыям адпусьціць студэнтаў для заканчэньня ВНУ.

ТРЭСТ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ

паведамляе, што ў дні кірмашу будуць функцыянаваць 3 чайныя:

1-я чайная—на пляцы Парыскай Камуны

2-я —на выстаўцы

3-я —у заезжым доме па рагу Нямігі і Ракаўскай.

БУДЗЕ АДПУСКАЦЦА ЧАЙ, ЗАКУСКА РОЗНАЯ І ІНШ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

АСАРТЫМЭНТ ТАВАРАЎ, ПРАДНАЗНАЧАНЫХ ДЛЯ ПРОДАЖУ МГРК НА КАЛГАСНЫМ КІРМАШЫ:

ГАЛЯНТАРЭЯ І ТРЫКАТАЖ, ГАТОВАЕ АДЗЕНЬНЕ, ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ, ШОРНЫЯ ТАВАРЫ, АБУТАК, НАЧЫНЬНЕ, СКАБЯНЫ ТАВАР, ПАРФЮМЭРЫЯ, ІНСТРУМАНТАЛЬНЫ ТАВАР, ЛЯМЕЦ БУДАЎНІЧЫ, МУЗЫЧНЫЯ ТАВАРЫ, КАНЦЫЛЯРСКІЯ ПРЫЛАДЫ, ГАДЗІНЬНІКІ, МАНУФАКТУРА, НАЧЫНЬНЕ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

Менскі гарадзкі камітэт саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю

склікае на 2 лістапада, роўна ў 8 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу харчавікоў імя Сталіна (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

агульна-гарадзкі кастрычніцкі зьлёт ударнікаў —работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю.

ПАРАДАК ДНЯ: 15 год Кастрычніка і задачы каапэрацыі і дзяржгандлю.

ДАКЛАД САКРАТАРА ЦК КП(б)Б т. Рыскіна.

Пасьля зьлёту канцэрт.

Білеты атрымаць у гаркоме саюзу (пляц Волі, Дом Гарпрафсавету).

Менгарком РКІД.

МЕНСКІМ аддзяленьнем Белгандлю ў дні міжраённага кірмашу БУДЗЕ РЭАЛІЗАВАНЫ

наступны асартымэнт тавараў на суму 500 тысяч рублёў:

гатовае адзеньне, мыла гаспадарчае, мыла туалетнае, трыкатаж, кіткі, мэбля, начыньне, галантарэя, муз. інструманты, шапкі зімовыя, смабяныя тавары, насьценныя гадзіньнікі і інш.

ВОДПУСК ТАВАРАЎ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА на пляцы Парыскай Камуны з магазыну № 6, 2-х ларкоў, 2-х фургонаў і з спэцыяльна пабудаванага павільёну.

Дырэкцыя.

Арцель „ЧЫРВОНЫ АБУТНІК“ ВЫСТУПАЕ на кірмашы з наступным асартымэнтам гатовых тавараў на суму 13 тыс. руб.:

БАЦІНКІ мужчынскія і жаночыя

ТУФЛІ „ „

ДЗІЦЯЧЫ АБУТАК

АБУТАН мужчынскі і жаночы (стары рамонтны) таксама будуць функцыянаваць з РАМОНТНЫЯ ЛАРКІ.

Рамонт будзе прымацца ад усіх калгаснікаў, рабочых і адноасобнікаў.

Павільён і ларкі знаходзяцца на пляцы Парыскай Камуны.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.